

КАЛЕГІЯ МІНАДУКАЦЫІ І ВЫНІКІ ДЗЕЙНАСЦІ ГАЛІНЫ ЗА 2020 2

ЯК ПРАВІЛЬНА СВАРЫЦЦА?



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЛЮТАГА 2021 г. ЧАЦВЕР № 31 (29400)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валянціна РУСАК, загадчыца аддзела сучаснай беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі:**

*«Мова, герб, сцяг, гімн — гэта найважнейшыя атрыбуты нашай дзяржаўнасці. Найбольш яркім з'яўляецца мова, якая выступае фактарам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, аб'ядноўвае людзей у этнічнае цэлае. Беларуская літаратурная мова — самабытная і адна з высокаразвітых славянскіх моў. Як найважнейшы элемент культуры, яна з'яўляецца неад'емным скарбам народа. І наша галоўная задача — зрабіць так, каб нашы дзеці і ўнукі сталі захавальнікамі культурнага кода нацыі».*

# Факультатыў здаровага жыцця



Яўген НАВІЦКІ з вучнямі сваёй школы Арцёмам ЧАРНЯЎСКІМ, Дзмітрыем КРАСНОЎСКІМ і Аляксандрам МІГУНОМ.

Дырэктар сярэдняй школы ў вёсцы Кальчуны Ашмянскага раёна Яўген НАВІЦКІ — настаўнік гісторыі, але мог бы выкладаць і фізкультуру. Малады дырэктар — спартсмен, ён гуляе за раённую футбольную каманду на пазіцыі абаронцы. Зімовыя віды спорту таксама ў пашане. Пакатацца пасля ўрокаў з вучнямі на лыжах — чым не адпачынак?

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **ВУП Беларусі ў студзені вырас на 1,3 %.**

• Вучэнне АДКБ «Кобальт-2021» будзе прысвечана барацьбе з незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі.

• **«Белпошта» да 23 лютага даставіць паштоўкі бясплатна.**

• Біяпаліва ў гранулах пачнуць выраблять два лягасы Мінскай вобласці.

• **Выпуск кардону на заводзе ў філіяле «Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы» ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Беларускія шпалеры» плануюць пачаць у красавіку.**

## СВЯТА КНІГІ, ЯКАЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ

### XXVIII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш






Фота Яны ХВЕДЧЫНА.

**Рознакаляровыя стэнды, усмешкі наведвальнікаў і размовы аб літаратуры: Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш адкрываецца ў дваццаць восьмы раз. За час сваёй дзейнасці яна зрабілася аўтарытэтнай пляцоўкай, на якой сустракаюцца кнігавыдаўцы, пісьменнікі і чытачы. У гэтым годзе выстаўка пройдзе пад слоганам «Кніга аб'ядноўвае людзей і краіны». Асноўная экспанентная ідэя — Садружнасць Незалежных Дзяржаў.**

СТАР. 3

Вы прасілі расказаць

## ПРАМА Ў СЭРЦА

### Кардыёлаг пра наступствы каранавіруса

**Ужо вядома, што COVID-19 «б'е» па розных органах і сістэмах чалавека. Пнеўманія — самае распаўсюджанае ўскладненне, але далёка не адзінае. Пацярпець могуць і печань, і ныркі, і сэрца. Як каранавірус «б'е» па чалавечым «маторы», мы распыталі загадчыка аддзялення Фрунзенскага раённага кардыялагічнага цэнтра (на базе 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска) Наталлю КАРПУК.**



СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

Парламенцкі дзённік

# На ўзаемным даверы і сяброўстве

## Візіт прэзідэнта Казахстана ў Беларусь чакаецца сёлета

**Пра гэта стала вядома падчас сустрэчы старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ з паслом Казахстана ў Беларусі Аскарам БЕЙСЕНБАЕВЫМ. Па словах спікера ніжняй палаты парламента, лейтматывам узаемадзеяння краін заўсёды былі добрыя адносіны паміж прэзідэнтамі.**

«Візіт прэзідэнта Казахстана ў Беларусь, які мы чакаем сёлета, дазволіць і далей умацоўваць нашы адносіны. Візіты заўсёды становяцца сімвалам, каб рэалізоўваць новыя ідэі, планы. Я думаю, і парламентарыі актыўна падключацца да гэтага», — заявіў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён расказаў пра вынікі шостага Усебеларускага народнага сходу і прынятыя на ім дакументы, падзякаваў кіраўніку пасольства Казахстана за ўдзел у форуме.

«Верагодна, вы ўпэўніліся, што ў гэты нявопросты момант у міжнародных адносінах, мы намагаемся рабіць усё, каб узмацняць народнае адзінства, умацоўваць эканоміку, бяспеку Беларусі. Разам з тым, мы праводзім гнуткую знешнюю палітыку. Казахстан заўсёды для нас быў сяброўскай краінай, і нашы адносіны заўсёды засноўваліся на ўзаемным даверы, сяброўстве, павазе і супрацоўніцтве», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што ведае пра высокі арганізацыйны ўзровень выбараў у Мажыліс парламента Казахстана, якія прайшлі ў студзені.

«Мы спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час будзе створана рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам Рэспублікі Беларусь. Не мне вам казаць, што значыць рабочая група. Наколькі я ведаю, вы былі ў складзе камісіі Сената Казахстана па супрацоўніцтве з Саветам Рэспублікі Беларусі. Мы чакаем, што летам бягучага года адбудзецца і візіт вашай рабочай групы ў Рэспубліку Беларусь», — дадаў Уладзімір Андрэйчанка.

Паводле яго слоў, Казахстан уваходзіць у дзясятку краін па ўзроўні знешнегандлёвага абароту з Беларуссю, а сярод краін СНД займае адно з вядучых месцаў. Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што трэба актыўна працаваць у гэтым плане і парламентарыям, бо зараз ідзе работа над новай дарожнай картай развіцця супрацоўніцтва краін на 2021—2022 гады.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Беларусі Аскар Бейсенбаеў сказаў, што асновай сувязяў з'яўляецца эканоміка, і тут нягледзячы на пандэмію, ёсць вынікі.

«У 2019 годзе разам з паслугамі наш тавараабарот перавысіў мільярд долараў. Канешне, падчас пандэміі крыху адбыўся спад, але, я ўпэўнены, гэты паказчык будзе пераўзыйдзены», — заявіў пасол. Ён падкрэсліў, што ў год старшынства Казахстана ў ЕАЭС яго краіна падтрымлівае ініцыятывы Беларусі ў гэтай арганізацыі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

---

У цэнтры ўвагі

Ігар ПЕТРЫШЭНКА:

# «Мы аддалі нашых дзяцей на водкуп сацыяльным сеткам і блогерам»

## На калегіі Міністэрства адукацыі падвялі вынікі дзейнасці галіны за мінулы год



Фота БелТА.

**«2020 год стаў для ўсіх гадам выпрабаванняў і праверкі на трываласць, у тым ліку і для сістэмы адукацыі. Сёння з упэўненасцю можна сказаць, што галіна спрацавала стабільна: у няпростых умовах адукацыйны працэс ва ўстановах адукацыі не быў сарваны, арганізавана прайшла ўступная кампанія ў ВНУ, каледжах і ліцэях, — падкрэсліў у сваім выступленні на выніковай калегіі Міністэрства адукацыі намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка. — На дадзены момант наша галоўная задача ў сістэме адукацыі — забяспечыць рэалізацыю ўстановак, якія былі агучаны на VI Усебеларускім народным сходзе. Гэта датычыцца развіцця вышэйшай адукацыі, правядзення маладзёжнай палітыкі, патрыятычнага выхавання».**

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што на працягу апошніх пяці гадоў практычна вырашылася праблема з забяспячэннем дзяцей месцамі ў дашкольных установах. За гэты час у рэгіёнах было пабудавана больш за 70 дзіцячых садкоў на 14 тысяч месцаў. Так, у асобных новых мікрараёнах яшчэ не забяспечана крокавая іх даступнасць, але гэтыя пытанні рэгулююцца.

— У далейшым будзе прадоўжана інтэнсіўнае будаўніцтва дашкольных установаў: да канца 2025 года запланавана пабудаваць больш як 90 садкоў на 21 тысячу месцаў (большасць з іх у Мінску і Мінскай вобласці). Хацелася б звярнуць увагу на наступную акалічнасць: давайце думаць, якія садкі і якой магутнасці планецца ўводзіць у тым ці іншым рэгіёне? Важна ўлічваць не толькі бягучы момант, але і бачыць работу дашкольнай установы ў перспектыве, бо мы ўкладваем немалыя бюджэтныя сродкі, а значыць і аддача, эфектыўнасць павінны быць адпаведныя. Разглядайце розныя варыянты, у тым ліку па адкрыцці сямейных дзіцячых садкоў, размяшчэнні дашкольных установаў або асобных іх груп на першых паверхах жылых будынкаў, тым больш што ёсць станоўчыя прыклады. Актыўна прыцягвайце інвестараў да будаўніцтва дашкольных установаў, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка. — Таксама хацеў бы спыніцца на актуальным пытанні — іх мадэрнізацыі і аснашчанасці сучасным абсталяваннем. Не кажу, што ў гэтым кірунку нічога не робіцца. У рамках падрыхтоўкі да новага навучальнага года частка дзіцячых садкоў рамантуецца, для іх закупляецца абсталяванне, але ў большасці выпадкаў гэтая работа больш нагадвае латанне дзірак, якія ўжо немагчыма не заўважыць і, як вынік такога падыходу, доля дашкольных установаў, забяспечаных надворным абсталяваннем, складае 74 працэнты. Са 101 басейна ў дзіцячых садках, размешчаных у сельскай мясцовасці, дзейнічае толькі 32, астатнія патрабуюць мадэрнізацыі. Скажыце, ці зможам мы ў такіх установах паспяхова вырашаць адну з асноўных задач, што стаіць перад сістэмай дашкольнай адукацыі, — па захаванні і ўмацаванні здароўя выхаванцаў? Таму звяртаюся ў першую чаргу да намеснікаў старшынняў аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама — забяспечце ў рэгіёнах распрацоўку і рэалізацыю плана мадэрнізацыі і забеспячэння абсталяваннем дашкольных установаў на бягучую пяцігодку.

Дзіцячыя садкі, як і школы, павінны праходзіць камісійную праверку перад пачаткам навучальнага года па адзіных патрабаваннях. У гэтай сувязі Міністэрству адукацыі сумесна з рэгіёнамі, Міністэрствам аховы здароўя і іншымі зацікаўленымі трэба прапрацаваць пытанне аб прыёме дзіцячых садкоў да 1 верасня па правілах, аналагічных для школ.

— Адна з ключавых задач галіны — забеспячэнне роўнага доступу да якаснай адукацыі для навучэнцаў усіх установаў, незалежна ад месца іх навучання: у гарадской ці сельскай школе, — адзначыў Ігар Петрышэнка. — Для гэтага праведзена немалая работа. Важным крокам стала адмена ўступных іспытаў у гімназіях і замацаванне магчымасці адкрыцця профільных класаў у любой школе, у тым ліку ў сельскай мясцовасці. З мэтай замацавання кадраў з 2019 года БПС-Сбербанкам і Міністэрствам адукацыі рэалізуецца праграма «Настаўнік для Беларусі». Разам з тым сярод 38 пераможцаў XXVIII Рэспубліканскага турніру юных фізікаў і 18 пераможцаў XVI Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіяды па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы, заахвочаных грашовымі прэміямі са спецыяльнага фонду прэзідэнта, няма ніводнага навучэнца з сельскіх школ.

З 30 выхаванцаў першай змены ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку толькі трое навучаюцца ва ўстановах адукацыі, размешчаных у сельскай мясцовасці. Не змяняецца і сітуацыя на ЦТ: па-ранейшаму сярэднія балы ў вучняў гарадскіх школ па шэрагу дысцыплін вышэйшыя...

Самы сур'ёзны недагляд, на думку намесніка прэм'ер-міністра, быў дапушчаны ў арганізацыі выхаваўчай, патрыятычнай і ідэалагічнай працы з моладдзю:

— Мы звялі яе да складання нейкіх планаў, праграм, метадычных мерапрыемстваў. І за папяровай работай не ўбачылі самае галоўнае — студэнта і навучэнца. Фактычна, аддалі нашых дзяцей на водкуп сацыяльным сеткам і блогерам. Падзеі мінулага года гэта пацвердзілі. Таму трэба яшчэ раз пагледзець і ўзмацніць выхаваўчы аспект у адукацыі.

Ігар Петрышэнка падкрэсліў, што ролю выхавальніка, настаўніка, кіраўніка ўстановы адукацыі складана пераацаніць:

— Ад вашай працы залежыць і якасць набытых ведаў, і тое, якія жыццёвыя ўстаноўкі атрымае моладзь. Сёння гэта асабліва актуальна. Трэба разумець, што паводзіны педагога, яго думкі і меркаванні — гэта прыклад для навучэнцаў, таму да кадравага падыходу і расстаноўкі патрэбна самая пільная ўвага. Выпадковых людзей сярод настаўніцтва быць не павінна. У сваім выступленні на VI Усебеларускім сходзе кіраўнік дзяржавы жорстка папярэдзіў усіх аб недапушчальнасці фактаў перагрузкі настаўніка непатрэбнай папяровай работай. Я задаваў пытанні педагогам, наведваючы Свіслацкі раён, але ніхто не можа адкрыць тайну — што самі настаўнікі разумеюць пад непатрэбнай работай. Хацеў бы звярнуць увагу на яшчэ адну трывожную тэндэнцыю — павелічэнне непатрэбнага электроннага дакументаабароту. Скажыце, калі ласка, чым абумоўлена патрабаванне з боку кіраўніцтва да выхавальніка і настаўніка ў абавязковым парадку стварыць тэлеграм-канал і ў ім публікаваць штодзённую справаздачу аб малазначных фактах сваёй дзейнасці, напрыклад, як прайшлі прагулка ці ўрок? Ідэя стварэння школамі і дзіцячымі садкамі тэлеграм-каналаў — добрая, алеператвараць яе ў фармальнасць, бачнасць бурнай дзейнасці, на мой погляд, недапушчальна.

— Мы прынялі шэраг дакументаў, пералічылі, якую канкрэтна дакументацыю павінен весці настаўнік і класны кіраўнік, — падкрэсліў у сваім выступленні на калегіі **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА**. — Скажыце, а што такое неўласцівыя функцыі? Абарона правоў дзіцяці? Выяўленне дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы? Забеспячэнне бяспекі ў школе? Работа з сям'ёй? Мне здаецца, што ўсё гэта функцыі педагогаў. А вось складанне настаўнікам справаздач замест адміністрацыі, выкананне нейкіх разавых даручэнняў — гэта зусім іншае. І калі вы пераклалі гэтую функцыю на настаўніка, то заплаціце яму. Што яшчэ трэба зрабіць на ўзроўні міністэрства? Якія прыняць нарматыўны акт? Мы гатовыя. Лічу, што трэба абмеркаваць гэтую праблему больш дэталёва ў найбліжэйшы час, сабраць усіх зацікаўленых і прыняць граматнае кіраўніцкае рашэнне.

Ігар Карпенка паведаміў, што Міністэрства адукацыі працуе ўжо над канцэпцыяй развіцця сістэмы адукацыі да 2035 года, у яе аснову будуць пакладзены даручэнні кіраўніка дзяржавы, дадзеныя на Усебеларускім сходзе: «Спадзяёмся, што ў хуткім часе мы апублікуем праект на нашым сайце і ўжо ў жніўні выйдзем з ім на чарговы Рэспубліканскі педагагічны савет, дзе з педагагічнай супольнасцю краіны прымем канцэптуальныя падыходы».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Здабыча нафты ў ЗША рэкордна ўпала з-за маразоў у Тэхасе



Агульны аб'ём здабычы нафты ў ЗША ўпаў на траціну — максімальна ў гісторыі — на фоне прыпынення работы свідравін з-за беспрэцэдэнтных маразоў ва ўсёй цэнтральнай частцы краіны. Аб гэтым паведаміла агенцтва Bloomberg са спасылкай на ацэнкі нафтатрэйдараў і прадстаўнікоў галіны. Толькі ў Пермскім басейне ў Тэхасе, найбуйнейшым нафтаносным раёне ЗША, вытворчасць абвалілася на 65 працэнтаў. Цэны на нафту выраслі да максімуму з пачатку года на фоне падзення здабычы. Моцныя маразы ў ЗША парушылі работу энергасістэмы ў Тэхасе, выклікаўшы перабоі ў энергазабеспячэнні, што таксама пацягнула за сабой прыпыненне дзейнасці шэрагу буйных нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў. На фоне зніжэння здабычы ў ЗША цана нафты маркі Brent перавысіла адзнаку ў $64 за бараль — упершыню са студзеня мінулага года.

### ААН папярэдзіла аб дэфіцыце прадуктаў у свеце з-за пандэміі



Бедныя краіны ў 2021 годзе сталі схільныя да яшчэ большай рызыкі сутыкнуцца з харчовым крызісам з-за павышэння цэнаў на прадукты, выкліканага пандэміяй каранавіруса, чым летась. Аб гэтым паведаміла газеце Guardian спецыяльны пасланнік ААН па пытаннях Саміта па харчовых сістэмах 2021 года Агнес Калібата. «Забеспячэнне харчаваннем скарацілася з-за COVID-19. Прадукты падаражэлі, а ў некаторых месцах сталі недаступныя людзям», — заявіла спецпасланнік. Гаворачы аб афрыканскіх краінах, спецпасланнік адзначыла, што становішча такіх дзяржаў, як Кенія, Самалі і Эфіопія, што сутыкнуліся са значным павелічэннем цэн на прадукты і дэфіцытам харчавання, ускладняецца. На думку Агнес Калібаты, летась сістэмы забеспячэння харчаваннем здолелі вытрымаць нагрузку. Аднак за мінулы год людзі вычарпалі свае рэсурсы ў выглядзе прадуктаў, фінансавых сродкаў, дапамогі сваякоў і цяпер сутыкнуцца з крызісам сам-насам, без падтрымкі.

### Ва Украіне стартаваў «вялікі распродаж турмаў»



Першую турму выставілі на продаж ва Украіне ў рамках «вялікага распродажу турмаў». Аб гэтым паведаміў міністр юстыцыі краіны Дэніс Малюська, перадала РІА «Навіны». Раней чыноўнік абвясціў пра старт «вялікага распродажу» ўстаноў выканання пакаранняў, усяго плануецца выставіць больш за сто такіх аб'ектаў. «Першы пайшоў!» Вялікі распродаж турмаў «дайшоў да этапу першага аўкцыёну. Калі хтосьці мае лішнія 220 мільёнаў (грыўнаў. — **Рэд.**, каля 7,85 мільёна долараў) і хоча набыць невялікую турму за некалькі кіламетраў ад Кіева — welcome», — напісаў Малюська на сваёй старонцы ў Facebook.

Блізкая ўлада

# Працаўладкаванне з варыянтамі

**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА правёў прыём грамадзян. У сувязі з эпідэмічнай абстаноўкай размова вялася па тэлефоне, паведаміла БелТА.**


Фота БелТА.

Шматдзетны бацька з Драгічына расказаў кіраўніку вобласці, што раней займаўся арганізацыяй масавых мерапрыемстваў і тым зарабляў. З-за пандэміі заказаў фактычна не стала, зарабляць няма чым, таму і звярнуўся з просьбай паспрыяць працаўладкаванню. Губернатар прапанаваў заяўніку разгледзець варыянт часовага працаўладкавання. А раённая служба занятасці павінна знайсці магчымы варыянт.

Жыхарка Жабінкі прасіла дапамагчы з работай сваёй 52-гадовай сваячцы. Тая па сямейных абставінах пераехала ў названы райцэнтр з Баранавіч. Жанчыне ж вельмі патрэбная работа. У гэтым выпадку Юрый Шулейка таксама даў даручэнне адказным работнікам аказаць дапамогу грамадзянцы ў пошуках работы.

У вёсцы Вярховічы Камянецкага раёна нядаўна закрылі туберкулёзную бальніцу. Будынкі засталіся. Жыхар населенага пункта пазваніў, каб пацікавіцца лёсам гэтых памяшканняў. Яму адказалі, што аб'ект выстаўляецца на продаж, і такім чынам будзе прыцягнуты ў гаспадарчы абарот.

Фермер з Ляхавіцкага раёна, які займаецца вырошчваннем агародніны, плануе пашырыць сваю гаспадарку. Ён звярнуўся з просьбай выдзеліць яшчэ 100 гектараў зямлі, якая знаходзіцца на тэрыторыі мясцовага сельгаспрадпрыемства. Заяўніку растлумачылі, што дзяліць гаспадарку няма рэзону, а вось у іншым месцы яму могуць прапанаваць участак. Такое даручэнне дадзена кіраўнікам мясцовай улады.

Жыхарка абласнога цэнтра ўнесла прапанову па паляпшэнні работы гарадскога транспарту. У гэты дзень на дыстанцыйны прыём да старшыні аблвыканкама трапілі жыхары Брэста і пяці раёнаў вобласці.

**Яна СВЕТАВА.**

Прыярытэты

# НЕ КОЛЬКАСЦЬ, А ЯКАСЦЬ

## У Гродзенскім аблвыканкаме падвялі вынікі мінулага года і паставілі задачы на 2021-ы

**Мяркуецца, што сёлета не толькі захаваецца леташняя дынаміка, але і ўдасца выйсці на паскоранае развіццё. У гэтым годзе рэгіёну прыйдзецца вырашаць задачы, скіраваныя на рост эканомікі, запуск новага інвестыцыйнага цыкла. Прадугледжана павелічэнне інвестыцый у асноўны капітал да 3,6 млрд рублёў. Першы год пяцігодкі пачынае фарміраваць базу, ад якой залежыць далейшы поспех. Пры гэтым арыенцір робіцца не на колькасць, а на якасць паказчыкаў.**

Бюджэт вобласці ў мінулым годзе выкананы з прафіцытам. Паказчыкі ндрэнныя — даходы амаль на 30 мільёнаў рублёў перавысілі расходы. Гэта дало магчымасць разлічыцца па крэдытах, выканаць у поўнай меры сацыяльныя абавязацельствы ў сферы будаўніцтва жылля і аб'ектаў інфраструктуры.

— Мінулы год быў няпросты, але ў рэгіёне ўдалося не дапусціць падзення эканомікі, — заўважыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.** — Валавы рэгіянальны прадукт выкананы на ўзроўні 100,1 %. Ндрэнна спрацавала прамысловасць з ростам 1,4 працэнта. Добрыя поспехі паказала сельская гаспадарка, якая ў некаторай ступені кампенсавала зніжэнне ў сферы транспарту і паслуг. Нам трэба зрабіць паглыблены аналіз


Фота БелТА.

работы ўсіх сфер эканомікі і знайсці аб'ектыўныя прычыны зніжэння і суб'ектыўныя недапрацоўкі, якія сёлета неабходна выправіць.

А вось станоўчыя тэндэнцыі і падыходы, на думку кіраўніка рэгіёна, варта прааналізаваць, пашырыць і ўкараніць ва ўсіх рэгіёнах. Без гэтага немагчымы рост рэальнага сектара эканомікі. Таксама стаіць задача павысіць збор падаткаў. Дарэчы, на сацыяльную сферу — адукацыю, ахову здароўя, культуру, спорт і сацыяльную палітыку — летась было накіравана 67,7 % даходаў. Пры гэтым падаходны падатак складае толькі 26 %. Астатнія расходы на сацыяльную сферу дзяржава кампенсуе з іншых крыніц.

Асноўны прырост у 2021 годзе плануецца атрымаць за кошт прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю і транспартных паслуг. Вытворчая сфера фарміруе больш чым 60 % паказчыкаў. Стаўка ў значнай ступені робіцца на аграрны сектар. Але не толькі. У ліку задач — прыцягненне прамых замежных інвестыцый, мадэрнізацыя вытворчасці, сельскагаспадарчых комплексаў.

На будучы год плануецца рэалізаваць амаль 200 інвестпраектаў, большасць з якіх — вытворчыя. У гэтым кірунку мяркуецца задзейнічаць усе раёны вобласці. З найбольш буйных — будаўніцтва новага азотнага комплексу «Гродна Азот» і дрэваапрацоўчага прадпрыемства ў Свіслачы. Разам з тым важным драйверам роста павінна стаць будаўніцтва жылля. Мяркуецца, што будзе ўведзена 420 тысяч квадратных метраў, з іх 145 тысяч — індывідуальнае жыллё. Сфера будаўніцтва, у тым ліку інвестыцыйны складнік, будзе адлюстроўваць сацыяльную накіраванасць дзяржавы.

— У сацыяльнай сферы захаваецца леташняя структура — сюды будзе накіравана 67,5 % усіх сродкаў, а гэта фінансаванне будаўніцтва дзіцячых садкоў, школ, медыцынскіх устаноў. У Гродне пачнецца праектаванне новай бальніцы, будуць выдзяляцца сродкі на рэканструкцыю іншых бальніц у абласным цэнтры і раёнах вобласці, — адзначыў Уладзімір Каранік.

Губернатар выказаў спадзяванні, што абмежаванні, звязаныя з пандэміяй, будуць паступова змяншацца, што дасць магчымасць забяспечыць рост у такіх галінах, як транспарт, лагістыка, сфера паслуг і турызм.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# СВЯТА КНІГІ, ЯКАЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Штогод арганізатары здзіўляюць крэатывам. Сёлета вы не проста прыходзіце ў будынак выставачнага цэнтра «Белэкспа», а запрошаны, як жаданыя госці, у вялікі дом, дзе жыве Кніга: цэнтральны стэнд выстаўкі-кірмашу падзелены на ўмоўныя пакоі. «Зала» — гэта галоўная пляцоўка. Тут выставілі найлепшыя кнігі ўсіх краін СНД, якія сталі пераможцамі міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі». Гэта яшчэ адна з «фішак» выстаўкі — конкурс праводзіцца ўжо сямнаццаты год, і за гэты час беларускія кнігавыдаўцы атрымалі 164 дыпломы рознага ўзроўню. А вось у «Кабінеце пісьменніка» размешчаны мастацкія, грамадска-палітычныя і культурныя выданні краін СНД. Немагчыма ўявіць кватэру без дзіцячага пакоя, таму і на выстаўцы ёсць аднайменнае аддзяленне. Ёсць і «Кухня» — месца, дзе кнігі «гатуюцца» і «выпякаюцца» пісьменнікамі. Як напярэдадні на прэс-канферэнцыі расказаў **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЫЕВІЧ,** там арганізатары паспрабавалі размясціць усе беларускія кнігі, якія былі выдадзены летась, а ўсяго выстаўлена да агляду каля пяці тысяч кніг.

Каб наведвальнікі змаглі паўнавартасна ахапіць такую вялікую выстаўку, прадугледжаны як анлайн-, так і афлайн-фармат. На YouTube канале Дома прэсы людзі з любой краіны змогуць убачыць рэпартажы з месца падзей. Не забыліся і аб традыцыйным сімпозіуме літаратараў «Пісьменнік і час», асноўная частка якога таксама пройдзе ў анлайн-рэжыме. Адзначым, што сімпозіум будзе інтэрактыўны: гледачы змогуць задаць пытанні беларускім і замежным пісьменнікам. **Дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК** расказаў аб яшчэ адной акцыі, якая датычыцца тых, хто спрабуе сябе ў літаратуры. У межах выстаўкі-кірмашу пройдзе літаратурны стартап «LitUP». Кожны мог даслаць твор, і калі пашанцуе, знойдзе будучага выдаўца сваёй кнігі. Цікава, што ў дадзеным конкурсе адсутнічала класічнае журы. Найбольш удалыя творы адбіраліся выдавецтвамі. Гэта было зроблена з мэтай, каб, па-першае, пазбегнуць суб'ектыўнасці, па-другое, спрасціць працэс пошуку твораў выдавецтвамі. 20 лютага адбудзецца фінал-прэзентацыя пятнаццаці найлепшых літаратурных праектаў.

Можаце паўдзельнічаць у яшчэ адной вельмі цікавай акцыі, пра якую расказала **першы намеснік Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ.** Праект ладзіцца ўжо ў трэці раз і мае назву «Паэтычны аўтобус»:

— Ён адправіцца па маршруце менавіта з моманту адкрыцця выстаўкі і будзе дзейнічаць на працягу ўсёй яе работы. Адпраўленне ад станцыі метро Няміга да самага выставачнага комплексу. Паэтычны аўтобус мае вельмі насычанае афармленне: у ім будуць размешчаны партрэты нашых пісьменнікаў і іх знакамітыя выказванні, яго ўпрыгожаць шарыкамі. Дапамог у гэтым Рэспубліканскі саюз моладзі.


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Як напярэдадні адзначыў **генеральны дырэктар «Макбел» Дзмітрый МАКАРАЎ,** падчас выстаўкі захаваны меры засцярогі: кожнаму наведвальніку пры ўваходзе вымяраюць тэмпературу, а стэнды размешчаны з улікам неабходнай сацыяльнай дыстанцыі.

**Арына КАРПОВІЧ.**




## Выдавецкі дом «Звязда» таксама не застаўся ўбаку і прыдумаў для вас шмат цікавінак. Раім наведаць!

### 18 ЛЮТАГА

На галоўнай сцэне ў 15:30—16:30 адбудзецца шэраг мерапрыемстваў да юбілеяў класікаў беларускай літаратуры: прэзентацыя кнігі «Іван Мележ. Пясняр Палесся» і прэзентацыя кнігі «Кандрат Крапіва. Шлях да неўміручасці».

На дзіцячай пляцоўцы ў 14:30 пачнецца прэзентацыя кнігі Ірыны Фраловай «Рамонкі на асфальце», а ў 15:00 запрашаем на прэзентацыю кнігі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Загадка прынцэсы Агнесы».

У Кабінеце пісьменніка а 14-й гадзіне адбудзецца аўтограф-сесія Інесы Плескачэўскай.

### 19 ЛЮТАГА

На галоўнай сцэне з 16:00 да 17:20 чакаюцца адразу дзве прэзентацыі. Уладзімір Ліхадзедаў прадставіць кнігі «Блакада» і «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», а затым Інеса Плескачэўская распавядзе аб сваім вопыце міжнароднай работы, які адлюстраваны ў кнігах «Як разгадаць Кітай» і «Без жалезнай заслоны».

На дзіцячай пляцоўцы ў 13:00 Жанна Міус прэзентуе сваю кнігу «Першакрасавіцкі суп». У 13:30 можна будзе пазнаёміцца з кнігай Міхаіла Дзеравянкі «Кацяня Пых і шчанюк Прыг». Праз невялікі перапынак, у 16 гадзін, Таццяна Атрошанка прэзентуе «Байкі ды казкі бабкі Параскі».

Падзеі выстаўкі не першы год выходзяць за межы аднаго будынка. У бібліятэцы імя Янкі Купалы па вул. В. Харужай, 16 а 14:30 адбудзецца прэзентацыя 6-й кнігі авантурна-прыгодніцкага цыкла Людмілы Рублеўскай «Авантуры Вырвіча, Лёдніка і Чорнай Меланхоліі».

Нагадаем, што ў гэты ж дзень адбудзецца міжнародны сімпозіум літаратараў, які пачне сваю работу ў 11: 00 і скончыцца ў 13:00, за дыскусіямі можна будзе назіраць анлайн.

### 20 ЛЮТАГА

У гэты дзень Выдавецкі дом «Звязда» будзе актыўна працаваць на дзіцячай пляцоўцы. У 13:00 вас чакае прэзентацыя кнігі Паўла Гушчынца «Прыгоды Букі Злюкі». Ірына Карнавухава распавядзе аб сваёй кнізе «У царстве свяшчэннага Байкала» у 14:30, а ў 15:30 адбудзецца прэзентацыя адразу трох кніг Кацярыны Хадасевіч-Лісавой: «Палёт на Вухуцію», «Знаёмцеся — #Падабай.к@!», «Жахлівчык».

### 21 ЛЮТАГА

На галоўнай сцэне ў 13:00 адбудзецца прэзентацыя зборніка вершаў Леаніда Дранько-Майсюка «Скарб».

Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш пачынае сваю работу 18 лютага і будзе дзейнічаць да 21 лютага.

# «Брэндам Беларусі павінна стаць пасяховая шматдзетная сям'я»





Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Ірына СЦЕПАНЕНКА, дэлегат VI Усебеларускага народнага сходу, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын:**

«Усебеларускі народны сход — форум унікальны. У нас ёсць магчымасць не толькі выпрацаваць калектыўнае рашэнне, а кожнаму ўнесці свае прапановы, навацыі, ідэі. Я як лідар жаночага руху вельмі рада сказаць, што ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі прыярытэтам названа сям'я. Столькі новых ідэй прагучала ў выступленні Прэзідэнта ў падтрымку традыцыйнай сям'і, мацярынства. Я ўпэўнена, што брэндам Беларусі павінна стаць пасяховая шматдзетная сям'я.

Па асноўным месцы працы я ідэолаг. Для мяне важна, што яшчэ адным стратэгічным кірункам вызначаны патрыятызм. Сёння вельмі актуальны для любога чалавека і арганізацыі дзейсны патрыятызм, калі ўсе без выключэння павінны працаваць на краіну, яе квітненне канкрэтнымі справамі».

# Фізкультурна-аздараўленчыя цэнтры, садкі, школы, жыллё

## Чым прываблівае Дзяржынскі раён

**Дзяржынск і Фаніпаль з'яўляюцца спадарожнікамі Мінска. Стварэнню камфортных умоў пражывання для людзей у гэтых гарадах аддаецца пільная ўвага. Не забываюць і пра іншыя населеныя пункты. Як будзе развівацца Дзяржыншчына ў найбліжэйшай пяцігодцы, што новага тут з'явіцца, расказаў «Звяздзе» старшыня Дзяржынскага райвыканкама Мікалай АРЦЮШКЕВІЧ.**

— У Дзяржынскім раёне ў гэтай пяцігодцы запланавана шмат новых аб'ектаў. У прыватнасці, у Дзяржынску будзе ўзведзены фізкультурна-аздараўленчы цэнтр. Менавіта гэты комплекс — даўняя мара жыхароў раёна. З такой просьбай звярнуліся да кіраўніка дзяржавы работнікі пры наведванні ім адкрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Дзяржынскі». Прэзідэнт пагадзіўся, што такі цэнтр сапраўды патрэбны. Аналагічны спартыўны аб'ект з'явіцца і ў Фаніпалі. У гэтым населеным пункце таксама праектуецца дзіцячы садок на 230 месцаў. Будаўніцтва дашкольнай установы мяркуем пачаць сёлета і, магчыма — паспеем узвесці да канца гэтага года. Фаніпаль мае вострую патрэбу і ў новай школе, таму што дзеючыя перапоўнены, і дзеці займаюцца ў тры змены. Тут жа плануецца новая школа мастацтваў, паліклініка для дарослых. А будынак дзеючай будзе перапрафіляваны пад дзіцячую. Новая ўстанова аховы здароўя дазволіць людзям атрымліваць больш якасныя медыцынскія паслугі, паколькі горад прырастае насельніцтвам. Цяпер у ім пражывае 18 тысяч чалавек, а да 2025 года, як прагназуецца, іх колькасць павялічыцца да 30 тысяч. Такі аб'ект з'явіцца адназначна. Гэта прадугледжана Генеральным планам развіцця горада. Дарэчы, зямельны ўчастак пад будаўніцтва ўжо адведзены.

У мікраараёне райцэнтра Чыгуначны таксама праектуецца комплекс «Дзіцячы сад — пачатковая школа». Мы бачым і ведаем, што трэба людзям, і робім усё неабходнае, каб увасобіць іх пажаданні ў рэальнасць. У прыватнасці, летась у Дзяржынску пачалі ўзвядзенне раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Мяркую, да лета ўвядзём яго ў дзеянне. Цяпер гэты цэнтр размешчаны ў будынку 1927 года пабудовы. Натуральна, яго трэба расшыраць, каб ахапіць рознымі відамі дапамогі, паслугамі як мага больш людзей. А на ўліку тут стаяць адзінокія і адзінока пражываючыя пажылыя грамадзяне, інваліды, дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі, шматдзетныя сем'і, асобы, што выйшлі з месцаў зняволення, без пэўнага месца жыхарства. Гэта


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

менавіта тыя катэгорыі, якія маюць патрэбу ў пастаяннай дапамозе. У Цэнтры прадугледжаны ўсе ўмовы для якаснага абслугоўвання: пункт пракату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, кабінеты для індывідуальнай работы, псіхалагічнага кансультавання, для работы гурткоў і майстэрняў, актавая і трэнажорная залы.

Будзем спадзявацца, што сёлета пачнуцца работы па рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў у Фаніпалі. Праект фінансуе Еўрапейскі банк развіцця і рэканструкцыі. Мадэрнізацыя ачышчальных збудаванняў вельмі актуальная для горада, паколькі ўзводзяцца новыя жылыя дамы і нагрузка на дзеючую сістэму з кожным годам узрастае. Акрамя таго, пастаянна пашыраецца і свабодная эканамічная зона.

***— Мікалай Іванавіч, індывідуальнаму ці шматпавярховаму жыллёваму будаўніцтву будзеце аддаваць перавагу?***

— Штогод мы ўзводзім 40-50 тысяч квадратных метраў індывідуальнага і столькі ж шматкватэрнага жылля. Паколькі практычна ўсе запланаваныя зямельныя ўчасткі пад індывідуальнае будаўніцтва ўжо выдзелены, у гэтым годзе мяркуем больш інтэнсіўна развіваць шматкватэрнае жыллё. Свабодныя месцы, ці так званыя плямы для ўзвядзення шматпавярховікаў закончыліся. Цяпер распрацаваны новы Генплан, дакументацыя, што прадугледжваюць размяшчэнне шматкватэрных дамоў, якія будзем будаваць больш маштабнымі аб'ёмамі. Такім чынам, сёлета ўзвядзём 90—100 тысяч квадратных метраў, а ў 2022-м, магчыма, і 120 тысяч.

У першую чаргу ставім задачу забяспечыць жылплошчай шматдзетныя сем'і, сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, а таксама тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У 2021 годзе ў райцэнтры запланаваны ўвод у эксплуатацыю чатырох шматкватэрных дамоў, дзе жыллё атрымаюць шматдзетныя. Практычна завершана будаўніцтва новага мікрараёна ў Дзяржынску.

***— Якія першачарговыя задачы ў аграпрамысловым комплексе?***

— Нарошчванне вытворчасці малака для таго, каб цалкам загрузіць перапрацоўку. Таму ў апошнія гады практычна ўсе нашы гаспадаркі актыўна займаліся і займаюцца будаўніцтвам сучасных малочнатаварных комплексаў. У адкрытых акцыянерных таварыствах «Маяк-78» і «Баравое-2003» працуюць па тры новыя комплексы з даільнымі заламі. У гэтым годзе ўвялі ў эксплуатацыю такія ў філіялах «Пяцігор'е» і «Фалька-Агра» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі». Закончылі будаўніцтва другой чаргі МТК у ААТ «Баравое-2003», у планах гэтага года — завяршэнне трэцяй чаргі — памяшкання для запускнога ўтрымання жывёлы.

Будуем малочнатаварны комплекс у ААТ «Кастрычніцкая рэвалюцыя». Да мая плануем запусціць у дзеянне малочны блок і памяшканне для ўтрымання дойнага статка. Яшчэ адзін МТК з'явіцца ў камунальным сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Путчына», пачалі манціраваць канструкцыі. У планах — новы комплекс у вёсцы Ляхавічы ААТ «Крутагор'е-Петкавічы».

Такім чынам, пасля завяршэння будаўніцтва гэтых комплексаў каля 80 працэнтаў дойнага статку перавядзём на сучаснае беспрывязнае ўтрыманне. Усё гэта дазволіць павысіць надоі малака. Калі ў 2019-м валавы надой па раёне склаў 123 тысячы тон, то ў 2020-м — 131 тысячу тон, рост 9,4 %. Сярэдні надой на карову ў 2020-м на ўзроўні 8096 кілаграмаў. У параўнанні з папярэднім годам плюс 525 кілаграмаў. У лідарах філіял «Фалька-Агра» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі», дзе атрымалі па 110 84 кілаграмы малака на карову. Гэта на 585 кілаграмаў больш, чым у 2019-м.

***— І ўсё ж Дзяржынскі раён — сельскагаспадарчы ці прамысловы? Якая галіна тут пераважае?***

— На сённяшні дзень актыўна развіваецца і прамысловасць. Штогод мы прырастаем двума-трыма прадпрыемствамі. І такім чынам аб'ёмы вытворчасці прамысловай прадукцыі ў грашовым выражэнні ў два з нечым разы вышэй, чым сельскагаспадарчай. Разам з тым, аб'ёмы апошняй — адны з самых высокіх у Мінскай вобласці, на ўзроўні Смалявіцкага і Мінскага раёнаў. Так што ў нас развітыя і сельская гаспадарка, і прамысловасць.

У гэтай пяцігодцы, калі Мінэнерга пабудуе падстанцыю ў Чарказах і ў Дзягілеве, можна будзе казаць аб узвядзенні новых прадпрыемстваў. У нас не хапае магутнасцяў для іх размяшчэння. Ахвотных адкрыць новыя заводы дастаткова, але аднаго жадання мала. Трэба глядзець на праблему рэальна. Мы нават не можам будаваць з гэтай прычыны электрадамы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**• Праз аб'ектыў**



# ПРЫГАЖОСЦЬ ВАЧЫМА ЧЫТАЧОЎ

**Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» вызначыў пераможцаў фотаконкурсу «Мой родны кут». Уладальніцай Гран-пры стала настаўніца з гарадскога пасёлка Карэлічы Ларыса ШУГЛЯ. Яна атрымала ад арганізатараў конкурсу дыплом і ноўтбук, а астатнія пераможцы — дыпломы і планшэты.**

— Здымак «Наша зямля» нарадзіўся па сутнасці выпадкова, — расказвае пра свой твор Ларыса Шугля. — Праязджала міма поля і ўбачыла, як там гуляюць дзеці. Проста сачыла за імі праз аб'ектыў. Вельмі ўдзячная рэдакцыі «СБ» за арганізаваны конкурс — гэта магчымасць для нас, чытачоў газеты, паказаць сваё бачанне радзімы.

Сама Ларыса Шугля — настаўніца пачатковых класаў, але пры гэтым дадаткова выкладае дзецям у школьным фотагуртку «Стоп-кадр». Для яе фота, хутчэй, хобі, чым прафесія.

Удзел у праекце прымалі як прафесійныя фатографы, так і аматары. На адрас рэдакцыі прыйшло больш за шэсць тысяч фотаздымкаў, якія былі размешчаны на сайце. Найбольш цікавыя публікаваліся на старонках газеты.

— Я вельмі задаволены актыўнасцю нашых чытачоў, — сказаў **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Дзмітрый ЖУК.** — У гэты год, абвешчаны Годам народнага адзінства, мы правядзём яшчэ два конкурсы. У работах нашых чытачоў ужо прасочваюцца элементы таго, што аб'ядноўвае наш народ як нацыю, як людзей, што жывуць на гэтай зямлі. Гэтым разам мы б хацелі ўбачыць праз аб'ектывы ўдзельнікаў конкурсу тыя моманты ў нашым жыцці, якія могуць стаць платформай для таго, каб у нашым грамадстве наступілі парадак і спакой.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**


| **ООО «Центр Белинвентаризация»** г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 | ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком<br>✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения<br>✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения |
| --- | --- |

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ» 8 (0232) 29 51 12**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
| --- | --- | --- | --- |
| 1 | Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-353672, площадью 69,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Пенязькова Д. Н., 59-1а. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000006005342 площадью 0,1200 га | **201 600,00** | **20 160,00** |
| 2 | Капитальное строение (торговый павильон) с инв. № 350/С-215588 площадью 76,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Свердлова, 3Б/1. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000008000218 площадью 0,2176 га (доля в праве пользования) | **185 000,00** | **18 500,00** |

| | |
| --- | --- |
| Срок подачи заявления | **по 16 марта 2021 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **18 марта 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете *«Звязда» от 18.02.2021 г.* |
| Условия продажи | Объекты продаются в собственность. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продовольственными товарами и общественного питания. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 2 (два) месяца. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел. (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**

Сямейная газета

Выпуск № 3 (162)

# ДОБРЫ ПРЫКЛАД

УТУЮ раніцу яна, як заўсёды, абірала і наразала гароднiну на суп. Ён, як і ўчора, дапамагаў унуку, які толькі што прачнуўся, выцягваць трактары з імправізаваных гаражоў. Звычайная раніца. Праўда, не зусім. Яна ўсё ж адрознівалася ад папярэдніх — 40 гадоў таму яны сталі мужам і жонкай.

Такія розныя. Яна — гараджанка. Ён — вясковы хлопец. Яна паходзіць з роду, чые імёны гучалі ў літаратуры, навуцы. У ім жа цячэ кроў звычайных працаўнікоў, якія сваім потам заслужылі права на кавалак зямлі. Яна — адукаваная, настаўніца малодшых класаў. У яго ж ёсць толькі атэстат аб заканчэнні дзесяцігодкі, усё жыццё адпрацаваў у калгасе. Яны вельмі розныя, але аднолькава добрыя, сціплыя і сумленныя людзі. Яны — мае маці і бацька, якія днямі адзначылі 40-годдзе шлюбу, рубінавае вяселле.

Лёс іх асабліва не песціў. Пахавалі першае дзіця, нават не паспеўшы даць яму імя. У самым пачатку дзялілі хату з бацькамі мужа, якія ўвесь час рабілі маладой гаспадыні заўвагі і нават «навязалі» ёй, гараджанцы, парася. Затым ім далі пакой у інтэрнаце. Маладая настаўніца хадзіла ў школу, а паўтарагадовага Валерачку, майго старэйшага брата, гадавалі чужыя людзі, бо сваякі, а найперш родныя бабулі ды дзядулі, мелі іншы клопат. Я нарадзілася ўжо ў «школьным» доме, дзе настаўнікам пашчасціла атрымаць службовыя добраўпарадкаваныя кватэры. Праз два гады мы пераехалі ў вялікую трохпакаёўку, у якой мае бацькі жывуць дагэтуль.

КОЛЬКІ сябе памятаю, тата шмат часу праводзіў на працы, а ў кожную вольную часіну лётаў у суседнюю вёску — дапамога была патрэбна чамусьці толькі яго бацькам. Жонка з двума дзецьмі павінна была спраўляцца сама. Мама неадноййчы расказвала, як удваіх з малалетнім сынам капалі бульбу. А яшчэ трэба было прапалоць, а восенню ацерабіць калгасныя буракі, надзел якіх штогод атрымлівала кожная сям'я з нашай вёскі. Потым хваробы пасыпаліся адна за другой. Прабадная язва — бацьку ледзь выратавалі. Пасля зламаў на рабоце нагу — і мама, не дабыўшы да канца свой дэкрэтны адпачынак (са мной ужо была раскоша — цэлыя тры гады!), мусіла ісці на работу, бо жыць жа неяк трэба. На шчасце, бацька паправіўся. Праўда, падводзіла здароўе і пасля. Моцна хварэла і мама. У дзясятым класе, калі яна не вылазіла з бальніц, я падоўгу заставалася за гаспадыню.

Помню, як бацькі перажывалі, калі мой брат кінуў вучобу ва ўніверсітэце. Як замест чарговай сумкі з правізіяй збіралі іншую: праводзілі сына ў армію. А колькі сівых валасоў дадалося, калі не ладзілася сынава жыццё і пасля войска. Незагойнай ранай стаў іхні разлад з жонкай, а найбольш — помста нявесткі (быццам бацькі ў чымсьці вінаватыя!), якая назаўсёды абарвала іх стасункі з адзінай унучкай. Адным словам, усяго хапіла! Але нягледзячы на ўсе цяжкасьці (а якое жыццё без іх!), выпрабаванні, здолелі захаваць сям'ю, за што я ім вельмі ўдзячная. Якое шчасце прыязджаць дадому, калі цябе чакаюць двое — мама і тата! Якое задавальненне назіраць, як яны ўдваіх возяцца з маім сынам, сваім любімым унукам — у прыклад многім маладым сем'ям, якія, ледзь што пайшло не па плане, бягуць разводзіцца. Адны вінавацяць у сваім нешчаслівым шлюбе іншых, другія спісваюць свой разлад на характар. Многія пасля і застаюцца адны, так не знайшоўшы сваю другую палову. Некаторыя забываюцца на агульных дзяцей, успомніўшы пра іх ужо ў старасці, калі самім патрэбна дапамога. Ёсць і такія, што нават пасля разводу кахаюць адно аднаго, але, лічаць, што зваротнага шляху няма.

АЛЕ ёсць прыклады і вельмі шчаслівага шлюбу, хоць кніжкі пішы. Я пра адзін такі ў свой час распавядала: спачатку ў раённай газеце, потым у сачыненні пры паступленні ў Інстытут журналістыкі. Пашанцавала: героі былі зусім побач. Мае бабуля і дзядуля па бацькавай лініі, якія пражылі разам 57 гадоў! Іхняму шлюбу многія зайздросцілі. Хоць, як расказвала бабуля Тарэса, будучы муж ёй адразу не спадабаўся: звычайны селянін, яшчэ і старэйшы на восем гадоў (падумаеш, вялікая розніца!). Але гэты, як яна думала, прасцячок аказаўся вельмі добрым і сумленным чалавекам. Толькі задумайцеся: за амаль шэсць дзесяткаў гадоў слова ёй дрэннага не сказаў! А які быў працавіты! І ў калгасе яго паважалі, і дома трымаў вялікую гаспадарку, а які каля хаты быў парадак. Калі мая бабуля пачала скардзіцца на суставы (колькі яе помню, з кіёчкам хадзіла), амаль усю «бабскую» справу ўзяў на сябе: і кароў даіў, і грады палоў, нават ягады збіраў. Нарабіўшыся, стомлены, яшчэ мог і ад жонкі нядобрае слова пачуць. Сам жа толькі і мог: «Тарэсачка, не злуйся». Дзядуля Іван! Першы ў вёсцы набыў тэлевізар, у Вільню на базар ездзіў на ўласным «Запарожцы» (такі быў толькі ў дырэктара калгаса). У кагосьці з аднавяскоўцаў здаралася бяда, беглі да дзеда: ведалі, што дапаможа. Трое дзяцей, шасцёра ўнукаў, сямёра праўнукаў. Вось як трэба жыць!

Думаеце, праблем не было? Якіх хочаце! Нам і не сніласся. Але ж на характар ніхто не скідваў, а, калі былі непрыемнасці, разам іх перажывалі, знаходзілі выйсце з любой сітуацыі. Нам, іх нашчадкам, у кожнага з якіх ужо свае сем'і, ёсць з каго браць прыклад.

**Вераніка КАНЮТА.**

Зрабі сябе сама

# ФЕЯ, ЯКАЯ ДОРЫЦЬ КАЗКУ



**У дзяцінстве наша гераіня марыла стаць настаўніцай, любіла прыдумляць гісторыі і потым расказваць іх сваім сябрам, запісвала першыя літаратурныя творы ў сшытак, з хваляваннем чакала іх з'яўлення на старонках друкаваных выданняў... Тое, што калісьці было марай, спраўдзілася — сёння яе творы перакладаюцца на іншыя мовы, а ў творчай скарбонцы 18 кніг для дзяцей і падлеткаў, яна з'яўляецца лаўрэатам шматлікіх рэспубліканскіх і абласных конкурсаў, лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Лепшы твор для дзяцей і юнацтва». Пра натхненне, квэсты-падарожжы, сям'ю і чароўнае ператварэнне ў Кніжную фею пагаворым з нашай госцяй — дзіцячай пісьменніцай, настаўніцай і мамай Кацярынай ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВОЙ.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Вакол нас

# Пачым заняткі для нашчадкаў?

## Маляванне, шахматы, спевы, мадэлінг, журналістыка, рамесніцтва, фотасправа... Які занятак абяруць вашы дзеці?

**Знаёміцца з рознымі прафесіямі сёння можна нават з малодшага школьнага ўзросту. Былыя палацы піянераў перасталі быць месцамі, дзе дзеці выключна малююць, танцуюць ці спяваюць. Сёння там хлопчыкі і дзяўчынкі атрымліваюць разнастайныя сучасныя веды, навыкі і ўменні, «прымяраюць» на сябе розныя прафесіі, выпрацоўваюць упрыгажэнні і калекцыі вопраткі, вучацца фатаграфаваць і рабіць радыё- і тэлеперадачы, блогі, мультфільмы, макеты будынкаў, працуюць над навуковымі праектамі і ствараюць мадэлі аўтамабіляў і робатаў. Нават замежныя мовы цяпер можна вывучаць па-рознаму. Напрыклад, пры дапамозе камп'ютарных тэхналогій ці дэбатаў на англійскай мове, ці кінаклуба, дзе пасля прагляду стужак на мове арыгіналу ідзе іх абмеркаванне... А чаму б не запісацца ў «англійскі тэатр», юныя акцёры якога ўдзельнічаюць у міжнародных фестывалях?**



### ДЗЕ?

Вядома, на спартыўныя, тэатральныя, мастацкія і музычныя гурткі дзіця можна запісаць у суседняй школе ці набраць нумары, пазначаныя на аб'яўках, якія расклеены па ўсім горадзе і праскокваюць у рэкламных роліках у інтэрнэце. Запіс у такія студыі, а таксама IT—школы, спартыўныя секцыі можа весціся круглы год. Дадатковая адукацыя сёння добра манетызуецца. Часам заняткі школьніка вылiваюцца бацькам у суму, не меншую за платную адукацыю старэйшых дзяцей у сярэдняй ці вышэйшай навучальнай установе. Напрыклад, індывідуальныя заняткі шахматамі ці ігрой на музычных інстументах могуць абыходзіцца у 100—180 рублёў і больш, за сотню пераваліваюць месячныя абанементы ў некаторых IT-школах, лічбавае маляванне можа пацягнуць на 190, захапленне карэйскай мовай — яшчэ 120 рублёў з сямейнага бюджэту, абанемент на навучанне плаванню (восем заняткаў на месяц) можа каштаваць 165 рублёў, а індывідуальныя заняткі з дзіцем і таго больш. Цэны могуць розніцца ў залежнасці ад таго, у які час (дзень ці вечар, будні ці выхадныя) дзіця наведвае заняткі, ад напаўняльнасці групы і месца. Напрыклад, можна плаціць за мастацкі (танцавальны, шахматны, спартыўны) гурток 60—80 рублёў на месяц альбо знайсці такі ж бясплатны.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

# СЯБРОЎСКІЯ ЖАРТЫ ЦІ ЦКАВАННЕ?



## Як вызначыць, калі адно перарастае ў другое

**Стварыць у школах бесканфліктны асяродак — такая мэта праекта па папярэджанні булінгу, псіхалагічнага і фізічнага гвалту «Сяброўскае і падтрымліваючае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі». Укараняць яго пачалі яшчэ летась на базе 26 школ краіны, трэць з якіх — у Мінску.**

### «Устаньце тыя, хто...»

Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) у партнёрстве з Інстытутам псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта спадзяюцца, што мадэль, якая паспяхова зарэкамендавала сябе ў Харватыі, Сербіі, Чарнагорыі і Балгарыі, дапаможа стварыць умовы для таго, каб школы сталі цалкам псіхалагічна бяспечным месцам.

Адна з пляцовак, дзе паспяхова прымяняецца тэхналогія бяспечнага асяроддзя ў школе, у тым ліку і праз рэалізуемы праект, — сярэдняя школа № 197 у Мінску. Карэспандэнт «Звязды» папрысутнічала на адкрытым уроку ў гэтай установе.

У васьмікласнікаў гэта былі другія заняткі па тэме булінгу, якія называліся «Устанаўленне правілаў». Пачаліся яны з абмеркавання таго, што адбывалася на папярэднім уроку. Гаворка ішла пра сітуацыі, якія вучні не хацелі б бачыць у сваім жыцці.

Пасля школьнікі гулялі ў гульню «Устаньце тыя...»: у каго ёсць сябры; каго хоць бы раз не прымалі ў гульню; у каго ёсць любімы занятак; каго абражалі; хто хоць бы аднойчы дапамагаў аднакласніку ў цяжкай сітуацыі; у каго хоць бы аднойчы бралі рэчы без дазволу. Сабраўшыся ў кола, дзеці ўставалі ў адказ на кожную прапанову... усе, так што відавочна: узнімаемая ў праекце тэма знаёмая і блізкая нашым школьнікам.

Афіцыйна гэту харвацкую мадэль прадставілі летам 2020-га. Пэўныя яе элементы пратэсціравалі ў пяці мінскіх школах, а з верасня распачалі маштабную работу ў 26 школах краіны, абапіраючыся на вучняў пятых—дзявятых класаў, расказаў **Дзмітрый ШЫЛІН, старшы каардынатар па пытаннях аховы дзяцінства Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі:**

— Для нашай краіны праблема падлеткавых стасункаў — даволі актуальная. Па выніках даследавання, якое праводзіла арганізацыя ЮНІСЕФ у 2018-м, 11,6 % вучняў 5—7 класаў і 11,3 % вучняў 8—11 класаў лічаць атмасферу ў школе несяброўскай. Прычына — цкаванне з боку аднагодкаў і вучняў старэйшых класаў, а таксама агрэсіўны настрой настаўнікаў ці школьнай адміністрацыі.

Склад вучняў 8 «Б» за апошнія гады амаль не мяняўся. Магчыма, у гэтым і крыецца сакрэт, чаму дзеці тут добра разумеюць адно аднаго. Часам мне здавалася, што яны проста падхоплівалі і працягвалі ўслых думку суседа.

Заняткі па праграме супраць булінгу пачаліся ў класе яшчэ ў мінулай чвэрці — з прагляду тэматычнага фільма. Гледзячы на чужыя праблемы, разважалі, як вырашаць свае, падзялілася **Ганна МАЖЭЙКА, класны кіраўнік 8 «Б» і настаўніца рускай мовы і літаратуры:**

— Цяпер мы шчыльна падышлі да вырашэння гэтага пытання і заняліся ім усур'ёз. Нашы дзеці мысляць досыць крытычна і ўмеюць паглядзець на праблему ў нечаканым ракурсе. Яны ўмеюць гаварыць, не саромеюцца і не закрываюцца. Гэта адзін з найлепшых класаў у маёй практыцы. Мы з самага пачатку, з пятага класа, вучыліся «прагаворваць» негатыў, калі хтосьці кагосьці крыўдзіў.

### «Кароль» вырашае

— Што вы адчуваеце, калі хтосьці падвяргаецца булінгу? — задаў пытанне валанцёр Мікалай, старшакласнік гэтай жа школы, які ўдзельнічае ў праекце. Заняткаў у межах мадэлі, дарэчы, усяго трое. І па іх выніках клас павінен сфармуляваць правілы паводзінаў для сябе, якія, у ідэале, трэба вытрымліваць і па-за яго межамі, каб зрабіць атмасферу ў школе больш добразычлівай.



У адказ пачуў: «Разгубленасць, неразуменне, за што такое робіцца», «жаданне пагаварыць з ахвярай, заступіцца за яе, спытаць у крыўдзіцеля, навошта ён гэта робіць».

— Як вы рэагуеце, калі бачыце, што адбываецца булінг? — наступнае пытанне.

«Стараюся дапамагчы разабрацца ў сітуацыі, даведваюся, навошта крыўдзіцель так робіць», «вырашаю спрэчку без фізічнага насілля», «спрабую спыніць гвалт і дапамагчы ахвяры прыйсці ў сябе, супакоіцца, асабліва калі гэта адбываецца на вачах вялікай колькасці людзей», «гавару з крыўдзіцелем, які, магчыма, нават не разумее, што ён робіць дрэнна, што гэта ўжо выйшла за межы жарту», — адказвалі школьнікі.

Самыя распаўсюджаныя сітуацыі вучні прайгралі праз гульню, у якой «кароль» (вучань у кароне) спрабаваў вырашыць праблему, з якой да яго звярталіся «падданыя».

— Аднакласнік узяў мой падручнік па геаграфіі і размаляваў яго, што мне рабіць? — была агучана першая праблема.

— Пагавары з гэтым аднакласнікам і высветлі, як здарылася, што падручнік размалявалі. Папрасі яго абмяняцца з табой сапсаванай кнігай або набыць табе новую. Калі ён адмаўляецца, звярніся па дапамогу да настаўніка ці чалавека, які мае ўплыў на «малявальшчыка», — пастанавіў «кароль».

— Аднакласнік зламаў мой ровар, што рабіць?

— Высветлі, як ён гэта зрабіў. Пагавары з яго бацькамі, каб знайсці рашэнне і прычыну праблемы.

**Заняткі па праграме супраць булінгу пачаліся ў класе яшчэ ў мінулай чвэрці — з прагляду тэматычнага фільма. Гледзячы на чужыя праблемы, разважалі, як вырашаць свае.**

Нашмат лягчэй дзейнічаць, калі атрымліваеш падказку ці згоду ад старэйшага чалавека, які ўжо быў у такой сітуацыі ці мае больш жыццёвага вопыту, каб падказаць рэальнае выйсце. Такія высновы рабілі школьнікі пасля гульні, калі абстрагаваліся ад «каралеўскіх» рашэнняў і разважалі, як быць і да каго звяртацца па дапамогу ў праблемнай сітуацыі, калі самому дамовіцца не атрымліваецца.

### Правілы ў нашым сумленні

Далей класны кіраўнік прапанавала вучням паразважаць, што здарылася б са светам, калі б усе правілы раптам зніклі.

— На дарогах без ПДР быў бы хаос, — кажа Ева.

— Пачалася б поўная анархія, кожны імкнуўся б уласныя праблемы вырашыць сваім шляхам, а не так, як лепш для ўсіх, — лічыць Даша.

— Людзі пачалі б рабіць, што хочуць, што нанясе ўрон іншым. Цяпер жа гэта не дазваляе рабіць не толькі сумленне, але і правілы, — упэўнена Маргарыта.

— Калі мы паважаем чужыя межы, то і нашы межы будуць паважаць, і ў далейшым гэта зробіць жыццё лягчэйшым, — выказалася Ліза.

Правілы ёсць у нашым сумленні. Мы стараемся і вырашыць нашу праблему, і не закрануць пачуцці іншых, каб усім было зручна, падвялі вынікі вучні.

— Каб мы вярталіся ў школу пасля выпускнога з пачуццём радасці, давайце распрацуем правілы для нашага класа, каб усім-усім было добра, — параіла настаўніца.

Пасля абмеркавання ў групах нарадзіліся такія прапановы: узаемная дапамога; аб'ектыўная крытыка; асабістая прастора; жарты, смешныя для ўсіх; павага да пачуццяў іншых і адсутнасць дыскрымінацыі. З гэтых прапаноў у наступным вывядуць шэсць галоўных правілаў, якія стануць асновай для паводзінаў і зносін у класе.

Паразважалі ў 8 «Б» і над наступствамі парушэнняў правілаў, каб не пакараць празмерна таго, хто іх парушыў. На трэціх занятках плануецца стварыць насценгазету, дзе ўсё гэта будзе запісана і стане для класа кіраўніцтвам да дзеяння і жыцця ў калектыве.

### Пад свае рэаліі

У рабоце па ўкараненні мадэлі супраць булінгу класным кіраўнікам і валанцёрам дапамагаюць ментары. Гэта, у асноўным, выкладчыкі з БДПУ, галоўная задача якіх — каардынаваць, інфармацыйна падтрымліваць, кансультаваць усіх уцягнутых у праграму. Апрабацыя харвацкай мадэлі таксама адбывалася з дапамогай ментараў, таму што немагчыма без змен перанесць вопыт адной краіны для выкарыстання ў іншай.

— Мы даём ацэнку з пункту гледжання навуковага абгрунтавання пэўных працэсаў. Прысутнічаючы на занятках, можам параіць, як удасканаліць тыя ці іншыя рэчы, якія методыкі выкарыстаць, калі ідзе дыягностыка, — расказала **Людміла ЯНЧУК, выкладчык БДПУ.**

**Клас павінен сфармуляваць правілы паводзінаў для сябе, якія, у ідэале, трэба вытрымліваць і па-за яго межамі, каб зрабіць атмасферу ў школе больш добразычлівай.**

— З інстытутам псіхалогіі мы супрацоўнічаем пару гадоў. За гэты час адаптавалі дапаможнікі па харвацкай мадэлі пад нашы рэаліі і асаблівасці школьнага працэсу, натрэніравалі 30—40 чалавек ментараў, атрымалі грыф Нацыянальнага інстытута адукацыі на выкарыстанне гэтага адаптаванага дапаможніка ў навучальным працэсе, распрацавалі інфармацыйнае суправаджэнне, каб школьнікі разумелі, што за праект праходзіць у іх школе, — дадаў Дзмітрый Шылін.

— Найбольш вострыя праблемы ў вучняў назіраюцца ў падлеткавым узросце, якраз у пятых—дзявятых класах, на якія і разлічана мадэль. Але ж з часам гэтыя школьнікі будуць навучэнцамі старэйшых класаў, і такім чынам мы атрымаем пераемнасць мадэлі, яе дзеянне захаваецца і ў выпускных класах, — упэўнена **Таццяна НІФАНТАВА, выкладчык Інстытута псіхалогіі БДПУ.**

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# Пачым заняткі для нашчадкаў?

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Пры выбары заняткаў для нашчадкаў абавязкова разлічвайце свае фінансавыя магчымасці. З цягам часу вам давядзецца знаходзіць сродкі не толькі на аплату ўрокаў. Так, удзел у спаборніцтвах, аплата дарогі ў іншы горад (краіну), дзе будзе выступаць дзіця, закупка касцюмаў для юных танцораў ці формы і інвентару для спартсменаў, матэрыялаў для заняткаў творчасцю — усё гэта выцягвае з бацькоўскіх кішэняў круглыя сумы. Прыцаніцеся, ці ўпэўнены вы, што пацягнеце такое дзіцячае захапленне? Для юнай зоркі, якая выкладваецца на занятках і якой яны падабаюцца, кінуць усё потым з-за недахопу грошай — вялікі стрэс.

Не палянуйцеся разам з малым зазірнуць на старонкі цэнтраў дадатковай адукацыі ў інтэрнэце. У Мінску, напрыклад, яны працуюць у кожным раёне. Вы будзеце ўражаны тым, колькі магчымасцяў адкрываецца для сучасных дзяцей і падлеткаў. І пры гэтым большасць гурткоў для беларускіх школьнікаў бясплатныя! Альбо тыя ж мастацкія гурткі ці цэнтры па вывучэнні замежных моў і сучасных тэхналогій значна таннейшыя за падобныя прапановы ад камерцыйных структур.

выдаткаваць на вывучэнне замежных моў. Але не трэба забывацца, што ўжо зараз машынны пераклад дазваляе працаваць з дакументамі. А ў далейшым новыя тэхналогіі дазволяць перакладаць з любой мовы яшчэ на больш высокім узроўні, з іх развіццём звязваюць і знікненне шэрагу прафесій.

У той жа час любы новы занятак прымушае дзіця думаць, эксперыментаваць, шукаць розныя рашэнні. А такія навыкі будуць запатрабаваныя заўсёды. У дадатак дзеці, якія маюць шэраг захапленняў, вучацца самаарганізацыі, усё ж, каб усюды паспець, важна ўмець размяркоўваць свой час. Дадатковая адукацыя — гэта і новыя знаёмствы, формы работы, нефармальныя зносіны, работа ў камандзе, прыналежнасць да пэўнага калектыву і пачуццё адказнасці, крэатыў, адкрыцці і захапленне вынікам сваёй працы.

Не дзіва, што хлопчыкі і дзяўчынкі пасля школы самі бягуць у разнастайныя гурткі, цэнтры, секцыі, бо там вяртаецца ці абуджаецца цікавасць дзіцяці да навучання, дэманструецца, якім разнастайным можа быць свет, даюцца магчымасці паспрабаваць сябе ў розных ролях, вызначыцца з тым, што падабаецца і што можа атрымлівацца.



Апошні год паспрыяў развіццю адукацыйных паслуг у віртуальнай прасторы. Напрыклад, зараз праз інтэрнэт можна вучыцца маляваць, займацца дэкаратыўна-прыкладной творчасцю і праграмаваннем, гуляць у шахматы, знаёміцца з сусветным мастацтвам і гісторыяй і нават развіваць суперпамяць. І зноў жа формы падачы матэрыялу тут розняцца — гэта могуць быць інтэрактыўныя платформы, загадзя запісаныя відэаўрокі ці работа з педагогам у жывым эфіры.

## НАВОШТА?

З якой мэтай вы хочаце аддаць дзіця на гурток? Адзін шлях, калі яно будзе развіваць здольнасці, якія ўжо мае. Другі — калі вы хочаце навучыць дзіця таму, што ў яго атрымліваецца дрэнна. Напрыклад, павольнаму і няўклюднаму хлопчыку складана гуляць у футбол. Яму трэніроўкі будуць давацца цяжэй, чым спрытным равеснікам, і нават калі ён будзе працаваць больш за іх, не факт, што зможа заваяваць прызавых месцаў і медалёў. Затое ў параўнанні з іншымі дзецьмі, якія не займаюцца ў спартыўнай секцыі, ён зможа нядрэнна гуляць, ганяць мяч, і хлопчыкі на дваровай пляцоўцы не будуць ужо адмаўляцца браць яго ў сваю каманду.

Даволі часта бацькі жадаюць даць дзіцяці ці ведаў і ўменняў, якіх не хапала ім самім. Але ці спатрэбіцца ўсё гэта, калі дзіця вырасце? Так, можна шмат часу

## ШТО?

Давайце зазірнем у былыя палацы піянераў. Там сапраўды вельмі шмат змянілася з тых часоў, як мы хадзілі туды самі.

Напрыклад, Рэспубліканскі цэнтр інавацыйнай і тэхнічнай творчасці і сёння збірае будучых інжынераў і канструктараў, матацыклістаў і картынгістаў. Толькі зараз там, акрамя спартыўна-тэхнічнага мадэлявання, дзеці вывучаюць і найноўшыя тэхналогіі. З'явіліся тут і першыя дыстанцыйныя заняткі для школьнікаў. З 10-гадовага ўзросту можна далучыцца да мадэлявання транспартнай тэхнікі, а з 14 вывучаць ахоўныя сістэмы і відэаназіранне.

Прапановы, якія сёння маюць цэнтры мастацкай творчасці, што дзейнічаюць па ўсёй краіне, — гэта цэлы сусвет, у якім таленавітыя педагогі прыадчыняюць шматлікія дзверцы на шляху да разнастайных захапленняў і адкрыццяў. Для вельмі многіх навучэнцаў з гэтых заняткаў пачынаецца шлях і ў будучую прафесію.

Гурткі, якія аб'ядноўваюць юных творцаў, — гэта і выдатны выхаваўчы рэсурс. Педагогі сістэмы дадатковай адукацыі вучаць не толькі ствараць сучасныя рэчы, але і знаёмяць з традыцыямі, рэгіянальнымі адметнасцямі. Дзеці сустракаюцца з народнымі майстрамі і калектывамі, цікавяцца гісторыяй і культурай, спрабуюць гэтыя веды перадаваць праз свае вырабы.

З'явілася шмат новых формаў работы. Напрыклад, рэканструяваць старыя абрады і ладзіць народныя святы разам з дзецьмі і педагогамі прыходзяць іх бацькі. Навучэнцы з розных студый рыхтуюць агульныя праекты. Напрыклад, юныя разьбяры па дрэве і дзяўчаты, якія працуюць з тканінамі. Удзельнікі студый дэкаратыўна-прыкладной творчасці дапамагаюць тэатральнаму гуртку — вырабляюць дэкарацыі і лялькі, а будучыя журналісты ствараюць пра гэта сюжэты і артыкулы.

На базе цэнтраў працуюць і аб'яднанні па інтарэсах для моладзі. Нават выпускнікі школ могуць прыходзіць сюды, каб вучыцца маляваць, шыць дызайнерскія рэчы, займацца арт-дэкорам (складанне букетаў і кампазіцый, выраб з палімернай гліны ўпрыгожанняў, стварэнне аўтарскага мыла, дэкупаж, мазаіка, квілінг, ф'юзінг, калаж, выцінанка, фларыстыка і г. д.). Хлопцы і дзяўчаты, якія хочуць стаць рамеснікамі, могуць запісацца ў студыю па пляценні з лазы і бяросты альбо пачаць ткаць на традыцыйных кроснах ці плесці паясы.

У цэнтрах дадатковай адукацыі дзеці і моладзь вучацца шыць, ствараць вопратку, сумкі, аксесуары, распрацоўваюць прынты для тканін. Запатрабавана сёння і fashion-ілюстрацыя, калі свае дызайнерскія задумкі можна выкласці на паперы.

У тэатрах моды юныя мадэлі вывучаюць асновы дэфіле, макіяжу, сцэнічнае і акцёрскае майстэрствы, удзельнічаюць у паказах калекцый.

Рыхтуюць у цэнтрах і фатографаў, блогераў, арганізатараў свят. Для падлеткаў створаны нават асобны гурток «манікюрны дызайн».

Актыўных дзяцей чакаюць у аб'яднаннях аматараў інтэлектуальных гульняў, клубах вясёлых і знаходлівых, гульцоў у настольныя гістарычныя гульні, турысцкіх гуртках, клубах юных інспектараў і ратавальнікаў.

Самыя маленькія гурткоўцы (з 2-3 гадоў) могуць прыходзіць з мамамі. Сярод прапаноў для малых — заняткі творчасцю, танцамі, рухомыя гульні, аздараўленчая гімнастыка, заняткі з лагапедамі, замежныя мовы.

З 5—7 гадоў дзетак ужо гатовы ўзяць у студыі моды, гурткі, дзе можна вырабляць брошкі, пярсцёнкі, цацкі, сувеніры. А можна паспрабаваць аддаць малога ў дзіцячую лабараторыю «DISCOVERY», дзе ладзяцца вопыты і эксперыменты ці акадэмію "Я — лідар" (эканоміка для маленькіх, англійская мова і развіццё-выя гульні).

Старэйшых хлопчыкаў і дзяўчынак збіраюць клубы маркетолагаў і бізнесменаў, «Акадэмія фінансаў і менеджменту», школа «Экаміка турызму».

А хто сказаў, што ў школьным узросце яшчэ рана думаць пра навуку? У сталіцы юныя даследчыкі могуць прыходзіць на сустрэчы аматараў астраноміі, гісторыкі — займацца на базе Нацыянальнай акадэміі навук. Гурткі «Юны хімік. Арганічная хімія», «Фізіялогія клеткі», «Урбаэкалогія», «Батаніка: расліны ў жыцці чалавека», «Біяразнастайнасць раслінная свету: сістэматыка раслін», «Свет рыб», «Батаніка: брыялогія» (вывучэнне імхоў і іх значэння для біясферы), «Птушкі Беларусі», «Эксперыментальная энтамалогія» працуюць таксама на базе НАН Беларусі.

Асобныя гурткі дапамагаюць дзецям разабрацца з псіхалагічнымі праблемамі. Праводзяцца заняткі на развіццё эмацыянальна-валявой сферы дашкольніка, на адаптацыю першакласнікаў да навучання, дзеці і падлеткі вучацца ўзаемадзейнічаць, лепш разбірацца са сваімі эмоцыямі і патрэбамі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Гуляем разам

# Гаджэт — сябар ці вораг бацькоў?

**Сёння многія бацькі заклапочаны раннім развіццём дзіцяці, каб ледзьве не з самых пялюшак яно хадзіла ў шматлікія студыі, гурткі, секцыі. Спрабуюць яго заняць «справай», каб ні хвіліны вольнага часу на «пустыя» гульні. А тут яшчэ з'явіліся гаджэты, якія трывала ўкараніліся ў нашым жыцці. Сучасныя тэхналогіі мы выкарыстоўваем у побыце, на рабоце, у вучобе і ў выхаванні дзяцей. Апошняе, у сваю чаргу, не так добра, як здаецца. Наколькі мэтазгодна давяраць развіццё сваіх дзяцей гаджэтам, мы вырашылі даведацца ў педагога-псіхолага сталічнага яслаў-сада № 527 Аляксандры Юр'еўны ЛЫСКАВЕЦ.**

Суразмоўніца дакладна можа сказаць, што дашкольны ўзрост — адзін з самых важных перыядаў у развіцці дзіцяці. Менавіта ў гэты час малое адкрывае для сябе сацыяльную арыентацыю — узаемаадносіны паміж людзьмі, правілы паводзінаў у грамадстве, розныя віды дзейнасці і грамадскія функцыі людзей. Самы лепшы спосаб растлумачыць і навучыць дзіця, як сябе паводзіць, — праз гульню.

Для малога гэта магчымасць знаёміцца з дарослым светам на дзіцячай мове, спасцігаць правілы жыцця, вучыцца ўзаемадзеянню і ўзаемадапамозе. Менавіта ў сюжэтна-ролевай гульні дзіця рэалізуе практычна ўсе свае магчымасці. У малым узросце праз сродкі гульні дзіця актыўна прайграе ролі: мамы і таты, урача і пацыента, прадаўца і пакупніка, і мноства іншых роляў. Дзякуючы ўсяму гэтаму маленькі чалавек пачынае разумець, як будаваць дыялог, як узгадняць свае дзеянні з іншымі, вучыцца дамаўляцца.

Правільна арганізаваная сюжэтна-ролевая гульня дапамагае дзіцяці асвоіць нормы паводзінаў, якія яму спатрэбяцца ў дарослым жыцці.

У некаторых гульнях дзеці могуць гуляць паміж сабой, але не варта забываць пра нагляд дарослага, які абавязкова павінен быць. Маленькія дзеці толькі пачынаюць спазнаваць свет, а дарослы чалавек ужо мноства разоў прайграваў усе гэтыя ролі. Мы, вядома, можам пакінуць дзіця сам-насам з гульнёй, каб яно само разбіралася, але пры сумеснай гульні дарослы можа паказаць правільную мадэль паводзінаў. Бо асноўная роля дарослага ў гульні — растлумачыць ідэю, размеркаваць ролі, пры неабходнасці стварыць праблемную сітуацыю і дапамагчы знайсці выйсце з яе.

На жаль, не ўсе бацькі гуляюць з дзецьмі, ёсць дарослыя, якія не разумеюць усёй важнасці такіх гульняў для развіцця малога. Многія знаходзяць адгаворкі, што ў іх няма часу або яны не ўмеюць гуляць, спасылаючыся на тое, што гэта не дарослы занятак.

Некаторыя бацькі імкнуцца адцягнуць увагу дзяцей камп'ютарнымі гульнямі. Дарослыя не прымаюць у іх удзелу, а дзіця тым часам занятае і не перашкаджае займацца сваімі справамі. Для дзіцяці ж гуляць у такія гульні значна лягчэй, бо няма неабходнасці ўзгадняць свае дзеянні з іншымі, падпарадкоўвацца, выконваць правілы паводзінаў. Таму камп'ютарныя гульні так падабаюцца дзецям. Большасць з іх матывуюць малое на дасягненне мэты — напрыклад, сабраць шмат ураджаю, перамагчы больш праціўнікаў, прайсці недзе хутчэй за ўсіх, але сацыяльнай накіраванасці ў такіх гульнях няма. Калі ў дзіцяці нешта не атрымліваецца ў камп'ютарнай гульні, то яно можа вельмі рэзка адрэагаваць на гэта, і, не знайшоўшы выхаду з сітуацыі, проста ўзяць і выйсці з гульні. Такім чынам, дзіця не атрымлівае патрэбнага вопыту, а ў далейшым жыцці яму будзе больш складана прыстасавацца да рэчаіснасці, чым дзіцяці, якое гуляла з бацькамі ў гульні.

І усё ж, камп'ютарныя гульні — добра ці дрэнна? Аляксандра Юр'еўна ўпэўненая ў тым, што для іх павінна быць меса, але не 24/7, і пад перыядычным кантролем бацькоў, бо далёка не кожная гульня падыходзіць для дзіцячай псіхікі. Можна, напрыклад, падпісацца на навучальны партал для дзяцей, і яны будуць чэрпаць карысную інфармацыю з інтэрнэту. Некаторыя дзеці нават не гуляюць у камп'ютарныя гульні, а любяць паглядзець цікавыя відэа.

Не забывайце праводзіць з дзецьмі больш часу, слухаць іх, размаўляць і, вядома ж, гуляць. Сюжэтна-ролевая гульня карысная не толькі для вашых нашчадкаў, але і для вас, бо гэта выдатная магчымасць хоць ненадоўга вярнуцца ў дзяцінства!

**Ірына СІНЬКЕВІЧ, студэнтка V курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# Без гендарных забабонаў

### Стаўленне да жанчын у карпаратыўным свеце мяняецца

**Жанчыны па-ранейшаму недастаткова прадстаўлены ў навуцы і ў сферы тэхналогій. Яны складаюць толькі 28 працэнтаў выпускнікоў тэхнічных факультэтаў і 40 працэнтаў — факультэтаў камп'ютарных навук і інфарматыкі. Пра гэта гаворыцца ў новым дакладзе ЮНЕСКА аб навуцы. Адзін з яго раздзелаў прысвечаны гендарным пытанням у навуцы, у прыватнасці размова ідзе пра тое, што пладамі «лічбавай рэвалюцыі» павінны карыстацца ў роўнай меры як мужчыны, так і жанчыны.**

«Нават сёння, у XXI стагоддзі, калі гаворка ідзе пра навуковыя дысцыпліны, жанчыны і дзяўчынкі застаюцца ў баку, — заявіла **генеральны дырэктар ЮНЕСКА Одрэ АЗУЛЕ.** —Жанчынам неабходна ўсвядоміць, што для іх ёсць месца ў навуцы, тэхніцы, інжынерыі і матэматыцы, што яны маюць права ўдзельнічаць у навуковым прагрэсе».

Але пакуль у свеце навукі па-ранейшаму пануюць мужчыны, асабліва ў прамыслова развітых краінах. Так, у Аўстраліі доля жанчын сярод выпускнікоў тэхнічных універсітэтаў складае 23,2 %, у Канадзе — 19,7 %, у Францыі — 26,1 %, у Японіі — 14 %, у Рэспубліцы Карэя — 20,1 %, у Швейцарыі — 16,1 % і ў ЗША — 20,4 %.

У дакладзе адзначаецца, што найлепшым чынам справы з адукацыяй жанчын у сферы дакладных навук ідуць у арабскіх дзяржавах. Напрыклад, у Алжыры доля жанчын сярод выпускнікоў тэхнічных ВНУ і факультэтаў складае 48,5 %, у Марока — 42,2 %, Амане — 43,2 %, Сірыі — 43,9 %, і Тунісе — 44,2 %. У Лацінскай Амерыцы шмат жанчын сярод студэнтаў з інжынернымі спецыяльнасцямі.

Мала жанчын і сярод ініцыятараў стартапаў, што звязана, збольшага, з доступам да фінансавання. У буйных тэхналагічных кампаніях сярод кіраўнікоў — у асноўным мужчыны. Нават калі жанчыны працуюць у сферы тэхналогій, нярэдка ім прыходзіцца сутыкацца з сур'ёзнымі перашкодамі на шляху кар'ернага росту: гэта можа быць, напрыклад, сыход у дэкрэтны адпачынак або прадузятае стаўленне начальства.

У апошнія гады ў карпаратыўным свеце стаўленне да жанчын некалькі змянілася, паколькі многія кампаніі разумеюць, што дыверсіфікацыя рабочай сілы — гэта спосаб да павелічэння прыбытку. Але на шляху да поспеху ў навуцы ў жанчын яшчэ шмат перашкод і першая з іх — абмежаваная магчымасць атрымаць патрэбную адукацыю.

Эксперты ЮНЕСКА ўпэўнены, што жанчыны павінны быць часткай лічбавай эканомікі, каб Чацвёртая індустрыяльная рэвалюцыя не замацавала традыцыйныя гендарныя прымхі.

Адной з мер па барацьбе з дыскрымінацыяй па прыкмеце полу ў навуцы з'яўляецца стварэнне базы даных «запыт на жанчын-навукоўцаў». У склад арганізацыі, якая займаецца гэтай базай, уваходзяць 500 жанчын-навукоўцаў. Яны дапамагаюць іншым жанчынам атрымаць адукацыю і працаўладкавацца, а таксама заахвочваюць тых, хто дамагаецца поспеху.

ЮНЕСКА таксама актыўна змагаецца з негатыўнымі стэрэатыпамі пра ролю жанчын у навуцы, у тым ліку ўручае жанчынам-навукоўцам прэстыжныя прэміі. Адна з такіх прэмій заснавана праграмай Л'Арэаль—ЮНЕСКА «Для жанчын у навуцы». Ужо на працягу 23 гадоў ЮНЕСКА штогод прысуджае ўзнагароды жанчынам з ліку навукоўцаў і выдае стыпендыі юным даследчыцам. У 2019 годзе ЮНЕСКА пашырыла колькасць катэгорый для міжнародных прэмій і стыпендый, уключыўшы ў іх дасягненні ў галіне матэматыкі і камп'ютарных навук — якраз таму што жанчыны недастаткова шырока прадстаўлены ў галінах, якія ляжаць у аснове Чацвёртай прамысловай рэвалюцыі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# Мара — «злавіць» сусветны тытул

## Чэмпіён Беларусі па фідэры-2016 аб спартыўнай рыбалцы, здымках для YouTube і пацыфізме

**Гродзенец Аляксей ЯКУБОВІЧ не толькі заўзяты рыбак, але чалавек, моцна ўлюбёны ў свой край. Ён той, хто аддасць перавагу не марскому паляванню, а рыбалцы на Нёмане, таму што, як кажа сам, «гэта моцная прыхільнасць да месца, дзе нарадзіўся».**



### ПАКУЛЬ ЗРЫВАЕЦЦА

Вядома, што найбольш уражлівым перыядам жыцця чалавека з'яўляецца дзяцінства. У гэты перыяд мы актыўныя і цікаўныя, а таксама з лёгкасцю выбіраем пэўныя занятні і на ўсё жыццё захапляемся імі. У сям'і Аляксея рыбачыць падабалася і бацьку, і дзядулю. Але гутарку наш герой пачаў не з дзіцячых рыбалоўных дзённікаў, у якіх ён адзначаў свае поспехі ці пісаў справаздачы аб злоўленых яршах, а пра тое, што ў сваім захапленні важна эвалюцыянаваць.

— Калі ты ўжо навучыўся лавіць рыбу, а таксама «налавіўся» ўдосталь і ў цябе ёсць якасныя снасці, разумееш, што трэба развівацца далей. І ў нейкі момант я ўсвядоміў, што не хачу больш забіваць рыбу. Цяпер злавіў шчупака, узрадаваўся, пацалаваў і... выпусціў. Адчуваеш задавальненне ад моманту, калі ён сплывае, а не калі ты яго чысціш, а потым смажыш, — разважае Аляксей.

Сяджу, слухаю свайго героя і здзіўляюся: вось гэта сапраўдная эвалюцыя рыбалова! І сама пра сябе думаю: я ні за што на свеце не адпусціла б шчупака назад пад ваду. Ты ж спрабуеш яго злавіць, так доўга чакаеш, з трапятаннем выглядваеш, ці бярэцца, каб... каб зразумець, што кожная істота мае права на жыццё, а твой інтарэс — гэта проста спартыўны азарт?

— Гэта ўсё — барацьба за тытул або званне, — сцвярджае мой суразмоўніца. — Хоць некаторыя мужчыны, нават мае калегі па спартыўнай рыбалцы, якія прысвяцілі многія гады жыцця гэтаму занятку і якія маюць пэўныя дасягненні ў гэтым, па-ранейшаму застаюцца рыбаедамі.

Аб барацьбе за званне Аляксей кажа з асаблівым натхненнем. Прыкладна дзесяць гадоў таму ён пачаў захапляцца спартыўным рыбалоўствам, якое, дарэчы, у гэты час толькі развівалася ў Беларусі.

Сёння нашаму герою 40 гадоў. За гэты час яму даводзілася жыць у Сеуле, Цэнтральнай Амерыцы і Тайландзе — рабочыя моманты Аляксея, якія мы пакінем без падрабязнасцяў. І свет зусім не абмежаваўся трыма краінамі на карце падарожжаў, пазней яе дапоўняць гарады, у якіх гродзенец пабываў у якасці ўдзельніка чэмпіянату свету па рыбалоўстве. Сярод іх будуць Нідэрланды, Партугалія, Ірландыя, ПАР і многія іншыя.

Да гэтага Аляксей Якубовіч некалькі разоў перамагаў у рэгіянальных і рэспубліканскіх конкурсах, бываў на спаборніцтвах у краінах СНД. Самая каштоўная ўзнагарода ў гэтым сэнсе — абсалютнае чэмпіёнства Беларусі па фідэры, якое ўдалося «вылавіць» у 2016 годзе.

> **Дарэчы**
>
> Таварыства выратавання на вадзе папярэджвае, што не варта выходзіць на тонкі лёд і рызыкаваць уласным жыццём або жыццём дзяцей. Справа ў тым, што лёд, які на першы погляд здаецца трывалым, на самай справе можа быць досыць тонкі. Дастаткова некалькі хвілін правесці ў ледзяной вадзе, каб астудзіцца да стану, калі аднавіць жыццёва важныя функцыі арганізма будзе немагчыма.

У сваю чаргу, у рыбалцы сусветнага ўзроўню ёсць свае асаблівасці. Гродзенец расказвае, што складаней за ўсё спаборнічаць з англічанамі.

— У многіх еўрапейскіх краінах вельмі развіты рыбалоўны бізнес. Калі ты проста эксперт, які піша справаздачы і здымае відэа, і з'яўляешся прадстаўніком якой-небудзь кампаніі, то ў цябе будзе вельмі вялікі заробак і з'явіцца магчымасць удзельнічаць у камерцыйных турнірах, што праходзяць дзясяткі разоў на год, а іх прызавыя фонды дасягаюць соцень тысяч долараў, — расказвае Аляксей.

На чэмпіянат свету па рыбалоўстве спартсмены імкнуцца патрапіць, каб атрымаць тытул. Многіх еўрапейцаў, захопленых рыбалкай, проста не цікавяць і не матывуюць грошы, але адваяваць званне чэмпіёна свету імкнуцца многія. Шэсць разоў Аляксей спрабаваў атрымаць яго і, на жаль, пакуль усё «зрываецца».

— Ці то бязрукі, ці лёс пакуль не дае атрымаць медаль, — смяецца рыбалоў. — Першы дзень выйграю, а на другі спачатку іду добра, а потым рыба зрываецца. І нічога з гэтым не зробіш. Па начах толькі рвеш валасы на галаве, маўляў, як так?

Дарэчы, Аляксей расказвае, што Гродзенскі рэгіён з'яўляецца самым актыўным удзельнікам розных спаборніцтваў па рыбалоўстве. Згуртаваная каманда, удзельнікі якой многія гады ідуць рука аб руку, не страчвае энтузіязму. Хоць летась праз пандэмію каранавіруса амаль усе спаборніцтвы былі адменены, верагодна, сёлета сітуацыя можа паўтарыцца.

### СВОЙ КАНАЛ ДЛЯ РЫБАЛОВАЎ

Акрамя любові да рыбалкі, блізкія Аляксея прывілі яму любоў да фатаграфіі. Верагодна, гэты інтарэс да фіксавання рэальнасці наклаў адбітак і на галоўнае захапленне. Доўгія гады гродзенец не проста выбіраўся за горад парыбачыць, але здымаў пра гэта цэлыя праграмы.

На працягу некалькіх гадоў атрымлівалася рыхтаваць кантэнт для расійскага тэлеканала «Паляўнічы і рыбалоў HD», а пазней для «Дыялогаў аб рыбалцы». Пазней матэрыялы для тэлебачання пачалі страчваць попыт, і гродзенец вырашыў здымаць для YouTube.

Канал Аляксея называецца «Moose From Belarus» і паступова набірае падпісчыкаў. Цяпер іх за 30 тысяч пры сярэдняй колькасці праглядаў 15—20 тысяч. Чалавеку, зусім не пасвячонаму ў рыбалоўныя справы (гэта значыць мне), было займальна. А ўсё таму, што гэта вельмі прыгожа.

Гродзенскі рэгіён, па словах Аляксея, досыць бедны на разнастайныя вадаёмы, але іх прыгажосць не адзначыць немагчыма. Кадры, знятыя ім, уражваюць. Гэта і ранішняя смуга над ціхай рэчкай, вакол якой мяккая зеляніна, або сіні іскрысты пейзаж зімовых азёр. Вось шуміць чарот, вось над роўнядззю вады пралятаюць журавы або лебедзі. І сярод усёй гэтай маўклівай карціны — чалавек. Ён ніколі не парушыць спакою, які спрабуе паказаць і перадаць гледачам.

— Але ў развіцці YouTube-канала ёсць шмат сваіх асаблівасцяў. Каб атрымаць мільёны падпісчыкаў і праглядаў, трэба сур'ёзна займацца прадзюсіраваннем. Дарэчы, больш праглядаў атрымліваецца, калі ёсць нейкія падарожжы ці жарты, кампаніі або пэўныя тусоўкі, — злёгку наракае Аляксей.

Тым не менш гэта ніша дазваляе быць незалежным.

### РЫЗЫКА І ПАЦЫФІЗМ

Не буду ўтойваць, што галоўнае пытанне, якое мяне цікавіла, было вельмі наіўнае. Чаму рыбакі, нягледзячы на паведамленні Таварыства выратавання на вадзе, папярэджанні іншых службаў, выходзяць на тонкі лёд? Ні адзін год не абыходзіцца без ахвяр зімовай рыбалкі.

Мой герой разводзіць рукамі — сказаць асабліва няма чаго, бо ў кожнага мужчыны на гэта свае прычыны. Хтосьці дрэнна ацаніў сітуацыю, не праверыўшы ўзровень вады, таўшчыню лёду або наяўнасць іншых прыродных уплываў, а хтосьці проста не думае ні аб чым.

Таксама не магла не спытаць, каго Аляксей ніколі не ўзяў бы з сабой на рыбалку.

— Часцей за ўсё я стараюся ездзіць з кімсьці, але, як правіла, дапамогі ад кампаньёна чакаць не варта. Калі аператар падчас здымак адыгрывае важную ролю, то з рыбаловам-памочнікам даводзіцца дзяліцца нязлоўленай здабычай, — разважае гродзенец. — Аднак калі перавярнуць пытанне, каго б узяў, то адназначна чалавека, які пра гэта нічога не ведае. Такіх людзей можна зацікавіць рыбалкай, нават калі яна ім раней не падабалася. Галоўнае, удала падабраць час і стварыць усю неабходную атмасферу і ўмовы.

Аляксей упэўнены, што сустрэча світання на рацэ — гэта незабыўнае відовішча, якое, безумоўна, у сябе ўлюбляе. І крыху пазней прызнаецца, што ні за што не ўзяў бы з сабой... цесця, таму што той не шкадуе нават самую дробную рыбку.

— Для яго задавальненне — убачыць вынік сваёй працы, гэта значыць смачна прыгатаваную страву на стале, — заключае наш герой. — Але я, напэўна, проста пацыфіст, мне яе вельмі шкада. Тым не менш старая школа рыбакоў сыходзіць, а маладых і юных на юніёрскай секцыі, якую я вяду, вучу з першых заняткаў адпускаць улоў. Нават калі кажуць, што «мама прасіла прынесці трафеі», пераконваю — «фотку пакажаш». Тое ж прывіваю і свайму сыну.

Таму, смяецца гродзенец, я вучу сваё дзіця адпускаць рыбку, а цесць — есці яе.

Да канца гутаркі мы дабіраемся да галоўнай разгадкі гэтай займальнай справы. Пытаю: «Аляксей, дык што ж для вас рыбалоўства?» Ён расплываецца ва ўсмешцы: «Ячшэ ў дзяцінстве, калі пісаў гэтыя дзённікі са справаздачамі, вырашыў, што рыбалоўства — гэта ўсё».

**Аліса СКІБА.**



# ФЕЯ, ЯКАЯ ДОРЫЦЬ КАЗКУ



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Кацярына, у адным інтэрв'ю вы пагадзіліся з выслоўем: «Той, хто піша для дзяцей, сам ніколі не пакідае краіну дзяцінства»... Давайце прыгадаем ваша дзяцінства, чым захаплялася будучая казачная фея, якія кніжкі чытала, кім марыла стаць?***

— Мне сапраўды думаецца, што нават калі я стала дарослай, для мяне не зачыніліся чароўныя дзверы, якія вядуць у краіну дзяцінства. У мяне ёсць ключ ад тых дзвярэй, і час ад часу ўдаецца вяртацца туды. Няхай толькі госцяй, як кніжная фея, якая піша для дзяцей. Там, у дзівоснай краіне дзяцінства, жывуць ні з чым не параўнальныя адчуванні і вобразы, якія назаўсёды застаюцца з намі. Там я — маленькая дзяўчынка Кацярынка з доўгімі светлымі коскамі і блакітнымі вачыма, якія глядзяць на свет з цікавасцю, шчырасцю і любоўю. Я любіла слухаць казкі, якія чытала мая бабуля Жэня. Яна пастаянна купляла нам, унукам, кнігі, выбірала выданні толькі на беларускай мове. Я і сёння, як вялікую каштоўнасць са свайго дзяцінства, беражліва захоўваю ў хатняй бібліятэцы купленыя ёю зборнікі «Бацькаў дар», «Людзей слухай, а свой розум май», «Беларускія народныя казкі», «Жаронцы»...

З маленства марыла быць настаўніцай, як мая мама Галіна. Абрала педагогіку, працую ў школе. І журналістам я ў свой час хацела стаць. На гэта сваё жаданне таксама не забылася і нават пэўным чынам ажыццявіла: час ад часу супрацоўнічаю з некаторымі рэспубліканскімі выданнямі, а яшчэ стварыла ў сваёй Ждановіцкай школе творчае аб'яднанне «Школьны прэс-цэнтр». Магу адзначыць, што пяць выпускнікоў нашай школы, якія наведвалі заняткі аб'яднання, абралі прафесію журналіста.

***— У кожнай маленькай прыгажуні ў дзяцінстве ёсць свой прыклад жанчыны, да якой яна хацела б быць падобнай. У кагосьці гэта настаўніца, у кагосьці — маміна сяброўка. Хто для вас быў такім прыкладам? І ці адчуваеце, што цяпер вы з'яўляецеся для многіх своеасаблівым ідэалам?***

— Аб прыкладзе з майго дзяцінства вы адгадалі! Мая першая настаўніца Лілія Уладзіміраўна сапраўды была і застаецца прыгожай жанчынай. Эфектная, стройная, яркая. Яна ўсім нам вельмі падабалася, і мы часта рабілі ёй кампліменты, звярталі ўвагу на яе прыгожыя сукенкі і нязменна высокія абцасы. Я і сёння выразна памятаю некаторыя яе ўборы, туфлі, залаты бранзалет-гадзіннік і кольцы-завушніцы. Вучні звяртаюць увагу на ўсё!

І я, калі прыйшла працаваць у школу таксама настаўніцай пачатковых класаў, чула шмат кампліментаў-захапленняў ад дзяцей. Гэта, канешне, радавала. Напрыклад, выклікалі ў мяне прыемныя эмоцыі і ўсмешку іх непасрэдныя параўнанні, калі пра кагосьці казалі: «Вельмі прыгожая, амаль як вы»...



Што да ідэала... Я сябе ідэалам не лічу, але прыемна, калі дзяўчынкі прызнаюцца, што хочуць быць падобнымі да мяне.

***— Кацярына, на кожную сваю сустрэчу з дзецьмі вы бераце сваіх сяброў — персанажаў вашых казак Падабайку, Вухціка, ВасільВасю, Пухліка... Зразумела, што яны нараджаюцца ў вашым уяўленні. А хто дапамагае вам ствараць іх у рэальнасці, у якасці цудоўных цацак?***

— Я вялікую ўвагу аддаю прэзентацыям і творчым імпрэзам, дзе сустракаюся з чытачамі і прадстаўляю ім свае кнігі. Я пішу для дзяцей і зацікавіць іх хочацца нечым незвычайным, каб ім запомнілася, каб захацелася чытаць. Для гэтага сама я магу завітаць да дзяцей у вобразе феі, а са старонак сыходзяць мае героі, з'яўляюцца розныя казачныя атрыбуты і інтэрактыўныя рэчы. Як гэта адбываецца? Нічога дзіўнага, звычайнае чараўніцтва! Мне пашчасціла пазнаёміцца з цудоўнай майстрыхай-чараўніцай Вольгай Лапінай, якая можа ўвасобіць мае самыя крэатыўныя ідэі. За што я ёй вельмі ўдзячна.

***— Калі казаць пра фею, якая стварае казкі, адразу ў думках з'яўляецца вобраз чароўнай істоты, якая лунае на сваіх паўпразрыстых тонкіх крылах, трымаючы ў руцэ пяро з аркушам паперы... Як сапраўды выглядае рабочы кабінет пісьменніцы-феі?***

— У мяне няма спецыяльнага кабінета, я нават пісьмовым сталом не карыстаюся. Гэта праўда. Проста я сапраўды лунаю на паўпразрыстых крылах натхнення ў сваім сусвеце фантазіі. Там жывуць мае персанажы, з імі адбываюцца цікавыя прыгоды, а я толькіназіраю за дзеямі і занатоўваю тое, што ўбачыла і пачула. Часам я запісваю новыя казкі на аркушы паперы выкшталцоным залацістым пяром, якое атрымала ў падарунак ад майстрыхі саламяных спраў Алены, але часцей мне дапамагае мой сябар ноўтбук. Калі вам стала цікава, як адбываецца мой творчы працэс, зазірніце ў кнігу «Знаёмцеся — #Падабай.к@!», на там адкрываюцца некаторыя таямніцы. Буду рада вітаць усіх зацікаўленых на маіх старонках у «Фэйсбуку» і «Інстаграме» @kaciarina_khadasevich_lisavaya і, вядома, чакаю сустрэч на старонках маіх кніг!

***— Якія пачуцці былі ў пачынаючай феі-казачніцы, калі яна ўбачыла на паліцах кнігарні сваю першую надрукаваную кнігу?***

— Гэта быў цёплы сонечны ліпенькі дзень 2008 года. У кнігарні «Светач» разам з кнігамі сапраўдных пісьменнікаў стаяла і мая першая дзіцячая кніга «Падарожжы ў Чароўны лес»! Я памятаю, якой прыгожай і асаблівай яна мне бачылася, згадваю водар друкарскай фарбы, радаснае тахканне ўласнага сэрца. Такія ўспаміны застаюцца ў памяці назаўсёды.

***— Вы ствараеце не толькі квэсты-падарожжы на старонках сваіх кніг, аднак самі пастаянна выпраўляецеся ў дарогу па гарадах ды мястэчках Беларусі... Можаце прыгадаць мясціны, у якіх вы пабывалі ўпершыню дзякуючы сваёй творчасці і куды хацелася б вярнуцца зноў?***

— Я недастаткова падарожнічала па роднай Беларусі. Такую высноеу я зрабіла, калі стала актыўна ездзіць па нашай краіне па запрашэнні бібліятэк. На пытанне «А вы былі ў нас раней?», часта адказвала адмоўна. Але вельмі рада, што за апошнія два гады я наведала Нясвіж, Гарадзею, Магілёў, Гомель, Браслаў, Дзяржынск, Докшыцы, Бягомль, Жодзіна, Заслаўе, Маладзечна, Салігорск, Іўе, Пружаны, Слонім... Дзесьці я бывала, але ў многія гарады і мястэчкі, якія зараз не назвала, бо можна доўга пералічваць, я завітала ўпершыню. Удзячна Выдавецкаму дому «Звязда» за шматлікія творчыя камандзіроўкі, у якія мы выпраўляліся разам. Шчырыя словы падзякі бібліятэкам і кнігарням за запрашэнні, вельмі прыемна, калі едзеш туды, дзе цябе чакаюць, гасцінна сустракаюць, арганізоўваюць сустрэчы з дзецьмі і іх бацькамі. Колькі сяброў-чытачоў у мяне з'явілася па ўсёй краіне! Буду рада зноў прыехаць, пабачыцца, прадставіць новыя кнігі, якія я напісала для вас, мае дарагія!

***— Аб чым вы марыце?***

— Мара павінна быць дзівоснай! Хачу паляцець да зорак, бо я іх вельмі люблю! Дарэчы, касмічная тэма часта прысутнічае ў маіх кнігах. Фея-пісьменніца можа здзейсніць касмічны палёт у сваім уяўленні. Таму прапаную не чакаць развіцця міжпланетнага турызму, а ўжо сёння падарожнічаць разам на старонках маіх кніг. Запрашаю зазірнуць у маю новую касмічна-рамантычную кнігу «Зорка нябесная. Зорка зямная».

А яшчэ вельмі чакаю, калі ў выдавецтва з'явіцца тэхнічная магчымасць выдаць кнігу-галаграму. Уявіце сабе: адкрываеце кнігу, героі ажываюць, рухаюцца над старонкамі і пачынаецца чароўнае дзейства...

***— А ці можаце выдзеліць сярод сваіх кніг самую любімую, дарагую для вас?***

— Выдзеліць адну? Гэта немагчыма! Кожная для мяне дарагая, любімая і па-свойму адметная.

***— Вядома, пісьменніцкая праца патрабуе больш вольных гадзін, пры гэтым існуе шмат іншых спраў — работа, сям'я... Адкажыце, калі ласка, як удаецца знаходзіць час для творчасці?***

— Калі любіш творчасць, лічыш яе справай свайго жыцця — час знаходзіцца. А яшчэ я ўдзячна маёй



У маленстве Кацярына марыла стаць настаўніцай, як мама Галіна.

сям'і за паразуменне і падтрымку. Калі, напрыклад, пасля работы ці ў выхадны дзень мне вельмі хочацца сесці за ноўтбук і, як праз чароўны партал, выйсці ў сусвет сваёй фантазіі, я магу зрабіць гэта. Муж і сын самі прыгатуюць вячэру ці абед. Яшчэ і фею пакормяць, калі яна праз некаторы час вернецца з казачнай краіны ў рэальнасць.

***— Неяк вы казалі, што можа быць розная фея, напрыклад Кветкавай. У залежнасці ад чаго фея можа памяняць свой вобраз?***

— У кожным творы я пакідаю частку сябе, застаюся жыць у сваіх кнігах. А калі прэзентую кнігу чытачам, то сыходжу са старонак, увасабляючыся ў розных вобразах. Кветкавыя казкі прадстаўляе Кветкавая фея, пра таямнічых касмічныя далячыні раскажа Зорная фея, пра чароўныя дзіцячыя сны распавядзе фея краіны Сноў, з серыяй розных кніг пазнаёміць Кніжная фея...

***— Калі не памыляюся, вашы кніжкі адрасаваны дзеткам малодшага школьнага ўзросту. Вядома, што першы ваш крытык — гэта сын Станіслаў, ён, дарэчы, з'яўляецца прататыпам многіх вашых герояў. Аднак дзеці хутка растуць, і ваш хлопчык ужо падлетак. Плануеце пашырыць узроставы дыяпазон сваёй аўдыторыі?***

— Так, Стасік вырас, яму зараз шаснаццаць гадоў. Я па-ранейшаму пішу для школьнікаў пачатковых класаў, гэта мая асноўная чытацкая аўдыторыя, але ёсць у мяне і кнігі для падлеткаў: «Код геніяльнасці», «Зорка нябесная. Зорка зямная», «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці», жахліўчыкі... На прэзентацыях для 5—7 класаў трэба мяняць вобраз, і я прыходжу да чытачоў, напрыклад... Кікімарай.

***— Кацярына, раскрыйце сакрэт, дзе бераце ідэі для напісання твораў?***

— Я і сама для сябе не раскрыла гэтую таямніцу. Няма такой валізкі, якую можна прывезці неабходнасці адчыніць і проста ўзяць цікавую ды прывабную новую ідэю. Задума, бывае, узнікае сама па сабе, альбо перажытыя ўражанні праходзяць праз глыбіні твайго сэрца і патрабуюць падзяліцца з чытачамі. Часам заўважыш цікавы прататып — і сюжэт пачынае вымалёўвацца сам.

***P. S.*** *Кацярына Хадасевіч-Лісавая запрашае чытачоў на XXVIII Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш, дзе адбудзецца прэзентацыя яе зборніка казак «Загадкі прынцэсы Агнэсы», а таксама знаёмства з кнігамі «Жахліўчыкі», «Палёт на Вухуцію», «Знаёмцеся — #Падабай.к@!», якія выйшлі ў Выдавецкім доме «Звязда». Прыходзьце 18 лютага а 15-й гадзіне (Дзіцячая пляцоўка) і 20 лютага а 13-й гадзіне. Для ўсіх ахвотных штодня будуць праходзіць аўтограф-сесіі каля стэнда «Звязды». Запрашаем!*

**Гутарыла Надзея ЗУЕВА.**
**Фота з асабістага архіва пісьменніцы.**

# СВАРЫМСЯ ПА ПРАВІЛАХ



## Што такое «кіраваная сварка», або Часам лепш гаварыць, чым маўчаць

**«У эмацыянальным плане кожны з нас падобны... на мультыварку. У кожнага ёсць клапан для выпускання лішняй пары: у адных гэта адбываецца апаратыўна і хутка, у іншых — строга ў пэўны час, па раскладзе. Трэція вырашаюць не адцягваць увагу на падобную лухту і пазбаўляюцца гэтага клапана. Менавіта такія людзі — самыя непрадказальныя: ніколі не ведаеш, калі і як магутна яны «шарахнуць»...**

Гэта радкі з кнігі бізнес-трэнераў Уладзіміра і Аляксандры Казловых «Канфлікт: удзельнічаць ці ствараць». Кніга напісана для бізнесменаў і кіраўнікоў вялікіх працоўных калектываў. Але на самай справе веды па кіраванні канфліктамі неабходныя ў паўсядзённым жыцці кожнаму. Таму што ні на рабоце, ні ў сям'і, ні ў навучальным калектыве немагчыма абысціся без сварак. Канфлікты непазбежныя, яны — арганічная частка любых адносін паміж людзьмі, частка паўсядзённага жыцця. Больш за тое, яны — рухавік прагрэсу, калі сварыцца правільна: цывілізавана, без разбуральных зрываў і неканструктыўнай «халоднай вайнушкі». Карацей, чытайце інструкцыю па кіраванні сваркай — і канфліктуйце на здароўе. Калі сварыцца правільна, гэта зробіць больш моцнымі любыя адносіны — і працоўныя, і любоўныя.

### НЕ ПАДАЎЛЯЙЦЕ КАНФЛІКТ

— Бесканфліктныя адносіны — нездаровыя адносіны, — кажа **сямейны псіхолаг Кацярына АЛЁХІНА.** — У любых адносінах канфлікт — нармальная, здаровая з'ява.

Псіхолагі адзначаюць, што ў нашай свядомасці канфлікт звычайна звязваецца з болем, негатывам і цяжкімі перажываннямі. На самай справе гэта сігнал аб тым, што не ўсё добра. Усяго толькі сігнал аб неабходнасці прывесці да нейкага агульнага назоўніка рознанакіраваныя, супярэчлівыя патрэбы і інтарэсы. І «шукаць вінаватага» тут — неканструктыўна. Значна правільней шукаць рашэнне, ці кампраміс. Таму — прэч страх (а мы заўсёды зведваем яго, калі ўзнікае незадаволенасць любімымі або значнымі для нас людзьмі). Пазбяганне канфлікту ўтойвае небяспеку. Рана ці позна непазбежны выбух, а выбух — гэта заўсёды разбурэнне. Сямейныя псіхолагі кажуць, што колькасць пар, якія расстаюцца з прычыны імкнення падаўляць і замоўчваць канфлікты, прыкладна такая ж, як і тых, што разводзяцца з-за бясконцых скандалаў.

Так што трымаць незадаволенасць у сабе не варта. Больш прадуктыўная кіраваная сварка — як магчымасць расставіць кропкі над «і» без абраз і эмацыянальнага перанапружання.

Чаму сварыцца карысна? Вось разумныя аргументы:

✓ Канфлікт — гэта дыягностыка: мы канстатуем, што праблема ёсць, і называем яе сваім імем.

✓ Кіраваная сварка — гэта эвалюцыйны крок у адносінах. Рашэнне знаходзіцца — адносіны развіваюцца.

✓ Разумны, цывілізаваны канфлікт выконвае функцыю скідвання напружання.

✓ Правільная сварка стымулюе — матывуе на лепшае разуменне самога сябе, самаразвіццё і самадысцыпліну.

#### ПРЫКЛАД З ЖЫЦЦЯ

*Ала працуе ў міжнароднай кампаніі, пастаянна пашырае свае працоўныя кампетэнцыі — вучыцца на курсах і самастойна. А яшчэ ў яе ёсць дзесяцігадовая дачка, якая не любіць чытаць. Затое любіць, калі ёй чытае мама. І часта ў выхадныя дні просіць маму пачытаць — прычым выразна і некалькі глаў запар. Мама адчувае раздражненне ў адносінах да дачкі — ёй сумна чытаць дзіцячыя кнігі, да таго ж мыццё і гатаванне ежы для ўсёй сям'і на некалькі дзён (як звычайна робіць у выхадныя мамы, што многа працуюць) ніхто не адмяняў. На змену раздражненню прыходзіць пачуццё віны. «Напэўна, я проста дрэнная маці, — думае Ала. — Мне павінна быць цікава чытаць кнігі сваёй дачцэ. Але якія бязглуздыя кнігі выбіраюць сучасныя дзеці! Я ў яе ўзросце ўжо чытала сама, прычым добрую, разумную мастацкую літаратуру або энцыклапедыю!» Калі б мама не душыла сваё раздражненне і нуду, яна б перавяла канфлікт у канструктыўную плоскасць. І зразумела б, што чытаць дзіцячыя кнігі ёй сумна, затое цікава, напрыклад, навучаць дачку азам праграмавання або падарожнічаць з ёй па віртуальных музеях, або разам гатаваць незвычайныя стравы. А яшчэ — што ёй не хапае часу на сябе. І што ёй неабходна знайсці ў выхадныя гадзіну ці дзве, каб пабыць сам-насам з сабой, аднавіцца і перастаць раздражняцца на сваіх блізкіх.*

### КАЛІ ПРЫХОДЗІЦЬ ЧАС СВАРЫЦЦА

Такім чынам, чакаць, пакуль адбудзецца моцны «выбух», мы не будзем. А значыць, канфлікт пройдзе не так хваравіта: заўсёды прасцей разабрацца з невялікімі праблемамі, чым разграбаць негатыў, што збіраўся гадамі. Перш за ўсё — пазбаўляемся ад эмацыянальнага складніка. Кіраваная сварка немагчымая, калі раздражненне зашкальвае, рукі дрыжаць, з вачэй цякуць слёзы і выдаваць гукі вы можаце толькі на такіх дэцыбелах, нібы апанент знаходзіцца за сценкай. Калі ваш стан такі — пачакайце гадзіну. А лепш назначце абмеркаванне праблемы на наступны дзень. Такім чынам вы пазбегнеце спантаннасці (з пытаннямі: «А ты хто такі?», абразлівымі абагульненнямі: «Ты заўсёды...», «Ты вечна...» і «Вось усё ў цябе так...») — бо ў адказ на гэта апанент непазбежна сыйдзе ў глухую абарону па прынцыпе: «А я што? Я нічога! Як што, дык адразу Касы!» У вас будзе час прадумаць аргументы, разумныя патрабаванні і дапушчальныя для вас кампрамісы. І размова адразу пяройдзе з эмацыянальнай у дзелавую, канструктыўную плоскасць.



#### ПРЫКЛАД З ЖЫЦЦЯ

*Алена і Андрэй вырашылі дзяліць работу па доме пароўну яшчэ тады, калі прымалі рашэнне пажаніцца. Прайшлі гады. Лена ходзіць на работу, Андрэй сядзіць «на аддаленцы». Таму яму ставіцца ў абавязак, у прыватнасці, адпраўляць пасцельную бялізну і вопратку з кошыка, дзе ўсё гэта збіраецца, у пральную машыну па меры неабходнасці, сушыць вымытае і пасля — прасаваць. Муж рэгулярна забывае пра гэта. Лена трывае — яна ж не хоча быць сварлівай жонкай. Але калі ў доме не застаецца ніводнага чыстага ручніка, а ў дзяцей — выпрасаваных маек, яна «выбухае». Прычым звяртае ўвагу на гэта Алена чамусьці ў самы непадыходзячы момант — калі спяшаецца, стамілася, засмучаная. У выніку здараецца сямейны скандал... Калі б Алена своечасова не толькі заўважала праблему, а і не замоўчвала яе, яна знайшла б простае рашэнне гэтай жыццёвай сітуацыі. Напрыклад, своечасова нагадала б мужу аб неабходнасці закінуць у пральную машыну бялізну або папрасаваць памытую. А можа быць, муж і жонка памянялі б дагавор — напрыклад, мыла бялізну б яна, а ён гатаваў бы вячэру.*

### НЕ ВОРАГІ, А ПАРТНЁРЫ

Памятаем аб тым, што падчас сваркі варта забыцца на вечнае пытанне «Хто вінаваты?» раз і назаўсёды. Лепш задаць іншае вечнае пытанне з той жа оперы — «Што рабіць?» У любым канфлікце ў роўнай меры вінаватыя абодва канфліктуючыя бакі. Так што абстрагуемся ад уласнай крыўды, імкнемся ўбачыць аб'ектыўную сітуацыю і шукаем рэальную прычыну супярэчнасці.

Псіхолагі разглядаюць канфлікт як варонку, перавернуты трохкутнік. Унізе — рэальная прычына, маленькая кропка, потым пласты становяцца ўсё шырэйшыя і шырэйшыя. Дык вось, нам трэба дакапацца да прычыны і назваць яе.

Больш высокі ўзровень канфлікту мае на ўвазе наяўнасць канфліктаў на кожным ніжэйшым узроўні, сцвярджаюць спецыялісты. І аналізаваць канфлікт трэба, рухаючыся ўглыб да ўзроўню, на якім ён з'явіўся. Таму што немагчыма вырашыць канфлікт на ўзроўнях, якія ляжаць вышэй яго вытокаў, яго каранёў. Уявім, першапачаткова ўзнікае канфлікт паміж мужам і жонкай. Потым у яго ўцягваюцца дзеці, цешча і свякроў, цесць і свёкар, браты-сёстры і сябры з абодвух бакоў. Адбываецца эскалацыя канфлікту, і абодва бакі ўжо не памятаюць, з чаго ён пачаўся і ў чым яго рэальная прычына. І спрабуюць разабрацца з «пладамі» застарэлай сваркі, замест таго, каб разбірацца з яе каранямі.

Кіраваная сварка — гэта (пласт за пластом) ачышчэнне канфлікту ад шалупіння негатыўных эмоцый, нязначных нюансаў і бытавых прэтэнзій, пакуль ён не застанецца «гол як сакол». Толькі тады магчымы наступны крок.

— А наступны крок — прыняць сітуацыю такой, якая яна ёсць. І пачынаць сумесную з апанентам працу па яе паляпшэнні, — кажа Кацярына Алёхіна. — У гэтай працы канфліктуючыя бакі — партнёры, а не непрымірымыя ворагі. Не варта ўспрымаць канфлікт як дуэль: калі канструктыўнае рашэнне не знойдзецца, пераможцаў не будзе. Абодва бакі акажуцца ў пройгрышы.

### СЛУХАЕМ ПРАПАНОВЫ

Уладжванне канфлікту — гэта заўсёды пошук кампрамісу. Каб знайсці кансэнсус, выказваемся самі і даём выказацца апаненту. Маецца на ўвазе не абвінаваўчае выступленне і не спроба апраўдацца — бо вы ж не ў судзе. Гаворка ідзе аб варыянтах вырашэння сітуацыі, якія прапануе кожны з бакоў. Далей — абмяркоўваем прапанаваныя варыянты і выбіраем найбольш канструктыўны і прымальны для абодвух.

— Пры абмеркаванні канфлікту самае важнае для абодвух бакоў — трымаць сябе ў руках, бо вельмі лёгка скаціцца на неканструктыўны ўзровень «Сам дурань». Калі вы адчуваеце, што не ў сілах справіцца з эмоцыямі, спыніце абмеркаванне і вярніцеся да яго пазней. Лепш перапыніць дыскусію на этапе, калі яна застаецца дыскусіяй, а не ператвараецца ў скандал. Выбухі эмоцый і ляпанне дзвярыма працуюць толькі ў жаночых раманах. У жыцці гэта шлях у нікуды, — канстатуе спецыяліст.

#### ПРЫКЛАД З ЖЫЦЦЯ

*Лілія Сяргееўна амаль трыццаць гадоў свайго жыцця аддала роднаму прадпрыемству, займае адказны пост, яе цэніць кіраўніцтва. Але ў кампанію прыйшоў таленавіты супрацоўнік. І дырэктар папрасіў Лілію Сяргееўну дапамагчы маладому калегу, пазнаёміць з тонкасцямі і нюансамі сваёй работы. Але паміж ёй і стажорам тут жа ўзнікла непрыязнасць, якая перарасла ў канфлікт. Лілія Сяргееўна абвінавачвала маладога чалавека ў непавазе да старэйшых, адсутнасці адказнасці і сур'ёзнага стаўлення да работы, некампетэнтнасці. Ёй не падабалася ўсё: тое, як ён вырашае прафесійныя пытанні, размаўляе, апранаецца. Той, у сваю чаргу, быў упэўнены, што яго «настаўніца» даўно не развіваецца ў прафесіі і закасцянела ў сваіх састарэлых поглядах на вытворчыя пытанні. Канфлікт дасягнуў адкрытай канфрантацыі. Лілія Сяргееўна адмовілася вучыць калегу — «аж да звальнення!», а ён, у сваю чаргу, паклаў на стол дырэктару заяву аб сыходзе «па ўласным жаданні». Калі б абодва бакі прааналізавалі свае эмоцыі і паспрабавалі зразумець адно аднаго, канфлікт быў бы ўрэгуляваны. Лілія Сяргееўна зразумела б: яна баіцца, што малады спецыяліст з часам зойме яе месца. А стажор, калі б не быў так зацыклены на непрыязнасці да «старой каргі», растлумачыў бы Лілії Сяргееўне, што яго «гадуюць» для аднаго з філіялаў кампаніі ў іншым горадзе. І сінтэз вопыту і маладых ведаў дапамог бы абаім у пад'ёме па кар'ернай лесвіцы.*

Напрыканцы — просты алгарытм разумнай сваркі, для тых, хто любіць схемы і формулы.

• Прыйсці да згоды з апанентам з нагоды таго, што вырашэнне канфлікту выгадна абодвум бакам — бо жыць (ці працаваць) усё роўна прыйдзецца разам.

• Выкласці сутнасць канфлікту. Прызнаць свае памылкі і прамашкі, якія сталі прычынай або пагоршылі канфлікт.

• Выслухаць апанента — яго бачанне сітуацыі.

• Перайсці да абмеркавання варыянтаў вырашэння канфліктнай сітуацыі. Прапанаваць свае кампрамісныя варыянты і прывесці аргументы на іх карысць.

• Выслухаць прапановы апанента па дасягненні кансэнсусу.

• Абмеркаваць саступкі, на якія згодны пайсці кожны з бакоў.

• Прыняць рашэнне, якое згладзіць канфлікт і ў перспектыве звядзе яго ў нішто.

— Вельмі важна падчас кіраванай сваркі паводзіць сябе карэктна, паказваючы калегу, што вы паважаеце яго і яго думку, або партнёру, што ён па-ранейшаму любімы вамі, а рознагалоссі — толькі часовая з'ява, — кажа псіхолаг. — Тады канфлікт толькі ўмацуе адносіны, а яго вынікам стануць прымірэнне і згода.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Извещение о проведении 3 марта 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, отдельные характеристики, местонахождение продаваемого имущества) | административно-бытовой корпус АБЗ «Гореничи» общей площадью 204 кв. м, инв. № 611/С-916; складское помещение для хранения дров общей площадью 39 кв. м, инв. № 611/С-34214; техническое помещение для обслуживания водонапорной башни общей площадью 10,2 кв. м, инв. № 611/С-34215; стол «Амадей» т102 (1 шт.); силовой тренажер HouseFit DH – 8157 (1 шт.); бильярд «Магнат – Плюс» 8 фут. (1 шт.); машина стиральная Gorenje WS43101 (1 шт.); водонагреватель Ariston SG HP 200V (1 шт.); киевница напольная ПАЖ-2 (материал ясень) (1 шт.); светильник «Венеция» (1 шт.); стул «Амадей» s102 (6 шт.); стул ИСО Black (15 шт.); тумба для ТВ «Ниагара» (2 шт.); чехол защитный для бильярдного стола 8ф (1 шт.); шары «Арамит Премьер» (1 шт.); шкаф с витриной «Дэнвер-Э-9М» (1 шт.); электросушилка для рук Puff-8820 (3 шт.); антенна Variant 60 (2 шт.); бра Орхидея 13200/2 (4 шт.); зеркало (1 шт.); жалюзи вертикальные «Лайн» 1,5*2,2 кв. м (1 шт.); жалюзи вертикальные Лайн 1,7*1,7 кв. м (4 шт.); кий «Гигант-М», 2РС 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); кий «Онтарио» 1РС целый, 149 см (материал: канадский клен) (4 шт.); кий «Ярость», 2РС 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); мягкий уголок «Лагуна комфорт» (1 шт.); емкость подземная, горизонтальная, металлическая 50 м³ (1 шт.); телевизор «Горизонт» 21KF19V (1 шт.); цифровой спутниковый ресивер Eurosat DVB-3023 (1 шт.) |
| **Местонахождение** | Минская обл., Березинский р-н, Капланецкий с/с, 2, 2/1, 2/2 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь: 2,3610 га, кадастровый номер: 620482302101000151 |
| **Продавец имущества** | ОАО «ДСТ № 5», г.Минск, ул. Лукьяновича, 4-253 |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 54 431,83 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 5 400,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 3 марта 2021 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 19.02.2021 по 01.03.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## 22 марта 2021 года состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Камволь»

Собрание акционеров пройдет по месту расположения Общества:
г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4-й этаж главного корпуса

Повестка дня

1) Отчет о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2020 год и основных направлениях деятельности Общества на 2021 год.
2) Отчет наблюдательного совета за 2020 год.
3) Отчет ревизионной комиссии за 2020 год. Заключение по результатам проведения ежегодной ревизии.
4) Аудиторское заключение, подготовленное по результатам проведения аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.
5) Утверждение годовых отчетов Общества за 2020 финансовый год.
6) Распределение прибыли и убытков по итогам работы Общества за 2020 год.
7) Порядок распределения чистой прибыли на 2021 год и 1 квартал 2022 года.
8) Избрание членов наблюдательного совета Общества.
9) Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
10) Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
11) Внесение неденежного вклада в уставный капитал Общества.
12) Увеличение уставного фонда путем выпуска дополнительных акций, размещаемых путем проведения закрытой подписки.
13) Утверждение условий договора закрытой подписки акций.
14) Досрочное прекращение закрытой подписки на дополнительно выпускаемые акции ОАО «Камволь» и утверждении ее результатов.
15) Утверждение решения о выпуске акций.
16) Заключение договора закрытой подписки.
17) Увеличение уставного фонда ОАО «Камволь» на сумму неденежного вклада.
18) Утверждение изменений в устав ОАО «Камволь», связанных с увеличением уставного фонда.
19) Передача акций в республиканскую собственность на счет «депо» Госкомимущества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу:
г. Минск, ул. Маяковского, 176, кааб. 211, тел. 354-16-22.
Начало работы собрания – 11.00.
Регистрация участников собрания с 10.30. до 11.00.
Список акционеров ОАО «Камволь» для участия в собрании акционеров будет составлен по состоянию на 15.03.2021.

УНН 100074393.

Частное предприятие «ЭАТЭП» сообщает о проведении 23.03.2021 г. торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества: изолированного помещения (офис) с инв. № 500/D-7060727(общ. пл. 23,2 кв. м), расположенного по адресу г. Минск, пр-т Независимости, 185, пом. 65Н стоимостью 71 000,00 белорусского рубля. Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by.

УНП 600198586

## Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 2 марта 2021 г. в 11.00 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 50 % после несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости – комплекса зданий и сооружений производственного участка, расположенных по адресу: Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. 50 лет Октября, 24, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Калинковичский ремонтно-механический завод» на праве собственности

**Состав лота № 1**

**Здание ремонтной мастерской, инв. № 333/С-108602,** ул. 50 лет Октября, 24/2. Назначение: здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения). Двухэтажное здание, 1970 года постройки. Общая площадь 6 201,7 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка. **Части здания (в т. ч. крыша) общей площадью 347,03 кв. м сданы в аренду с наибольшим сроком по 21.11.2025.**

**Здание, инв. № 333/С-21039,** ул.50 лет Октября, 24 (24-2; 24-1). Назначение: здание нежилое. Одноэтажное кирпичное здание, год постройки не определен. Общая площадь 1 972,0 кв. м. В состав здания входят два изолированных помещения: **помещение СТОЖ,** инв. № 333/D-17073, общая площадь 583,3 кв. м; **помещение мастерских,** инв. № 333/D-17074, общая площадь 1 388,7 кв. м.

**Здание пункта ТОМТП, инв. № 333/С-148464,** ул. 50 лет Октября, 24/1. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Одноэтажное здание, 1983 года постройки. Общая площадь 1 408,9 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка.

**Здание материально-технического склада, инв. № 333/С-148463,** ул. 50 лет Октября, 24/5. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Одноэтажное кирпичное здание, 1968 года постройки. Общая площадь 828,6 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка.

**Здание станции технического обслуживания, инв. № 333/С-148442,** ул. 50 лет Октября, 24/4. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Одно-двухэтажное здание, 1970 года постройки. Общая площадь 254,7 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка.

**Здание проходной, инв. № 333/С-148462,** ул. 50 лет Октября, 24. Назначение: здание административно-хозяйственное. Одноэтажное здание, 1970 года постройки. Общая площадь 87,5 кв. м. **Часть здания – 75,30 кв. м сдана в аренду сроком по 06.10.2025.**

**Ограждение территории РАПТ, инв. № 333/С-149102,** ул. 50 лет Октября, 24. Назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства. Год постройки 1970. Общая площадь 805,0 кв. м. Составные части и принадлежности: забор, два ограждения, двое ворот.

**Начальная цена 670 181,82 рубля** (в т.ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток 6 701,82 рубля** (в т.ч. НДС по ставке 20 %)

***Земельный участок** для обслуживания комплекса зданий на праве постоянного пользования площадью **3,2431 га** с кадастровым номером 322350100002002657. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь*

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул.Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 1 марта 2021 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 **2 марта 2021 г.**

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по лоту № 1 согласно извещению в газете «Звязда» от 18 февраля 2021 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 15 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объектов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объектов.

*Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 30.07.2020 № 146, от 22.09.2020 № 184, от 09.12.2020 № 240*

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47.**
**сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: ОАО «Калинковичский РМЗ», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Заводская, 7. тел.: 8 (02345) 3-84-06, 8 (029) 120-51-29, 8 (029) 120-51-62.**

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» сообщает о внесении следующих изменений в извещение (информацию) о проведении 23 февраля 2021 года 299-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (опубликовано в газете «Звязда» 22.01.2021):

- предмет аукциона № 53 исключается из текста публикации в связи с отказом арендодателя от проведения аукциона.

Телефон для справок +375 (17) 360 42 22. Адрес в сети интернет www.mgcn.by.

УНН 190398583.

## «Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!

Собрание акционеров состоится 31 марта 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17, в актовом зале.

ПОВЕСТКА ДНЯ

**1. Отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2020 год и основных направлениях деятельности в 2021 году.**
**2. Отчет ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2020 год.**
**3. Отчет наблюдательного совета общества о проделанной работе в 2020 году.**
**4. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2020 год.**
**5. О распределении прибыли и убытков.**
**6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.**
**7. Об определении размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.**

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Киселева, 26а, приемная генерального директора) в рабочие дни в период с 15 по 30 марта 2021 г. с 13.00 до 15.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Акционерам, передавшим на основании доверенности свои полномочия на участие в общем собрании членам наблюдательного совета, участие в собрании не обязательно.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании – в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17, в актовом зале (3-й этаж). При себе иметь следующие документы: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность».

УНП600024712.

## Извещение о проведении 9 марта 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. номером 611/С-498, общей площадью 47,3 кв. м, наименование – трансформаторная подстанция; трансформатор, инв. № 572.1, 1979 года ввода в эксплуатацию; электрощитовая высокого напряжения, инв. № 572.2, 1979 года ввода в эксплуатацию; электрощитовая низкого напряжения, инв. № 572.3, 1979 года ввода в эксплуатацию |
| Местонахождение: Минская обл., Березинский р-н, Поплавский сельский совет |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,0056 га, кадастровый номер – 620484300001000007 |
| Начальная цена: 420,47 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 140,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.
**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 9 марта 2021 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 19.02.2021 по 05.03.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

# СЮРПРЫЗ



**Жыццё пражыць — не поле перайсці. Дарога жыцця не заўсёды роўненькая. Час ад часу спатыкаюцца ўсе. Калі любіш чалавека, памятай, што ён таксама памыляецца, і вучыся дараваць. У кожным з нас столькі намяшана... Хачу расказаць адну гісторыю, якая мяне ўразіла.**

Гадоў колькі таму накіравалі мяне на курсы павышэння кваліфікацыі. Група сабралася разнамасная, хтосьці ў дарагіх ботах да калена, а хтосьці ў растаптаных чаравіках. Хтосьці ў норковым футрачку, а хтосьці ў заношаным палітончыку. І ўзрост у жанчын быў розны, і погляды на жыццё.

Выкладчыкі ставіліся добразычліва, наведванне было вольнае, і мы, задаволеныя зменай абстаноўкі, не асабліва ўнікалі ў прадметы. Аднак адна выкладчыца мне запомнілася на ўсё жыццё. Гэтую жанчыну Бог не надзяліў кідкай прыгажосцю, але яна была прыемнай, ахайнай і дагледжанай. Камплімент «прыгожыя вочы», мабыць, быў адзіны, які можна было сказаць пры яе знешнасці. Вось я ёй яго і сказала. Вочы ў яе былі сапраўды прыгожыя, акуратна падфарбаваныя, карыя з доўгімі вейкамі, а галоўнае, разумныя і праніклівыя... Яна ўсміхнулася ў адказ і нечакана зрабіла адступленне ад тэмы, расказаўшы нам сваю гісторыю.

Аповед быў кароткі, але застаўся ў памяці. Не адной сяброўцы я потым дала параду, выкарыстоўваючы вопыт гэтай жанчыны, і мне ён дапамог. І хоць на той момант яе аповед я прыняла ў штыкі, аднак з часам абдумала і зразумела — яна мае рацыю.

Выкладчыца была натуральнай шэрай мышкай, але добразычлівай. Яна пачала проста, з лёгкай усмешкай: «Камусьці Бог дае прыгажосць, камусьці розум, а камусьці добрага мужа. Мне даў добрага мужа. Я заўсёды была замухрышкай, а калі без алегорый — проста непрыгожай. Ну што тлумачыць — вобраз перад вамі, і гэта ўжо з улікам каляровых лінзаў замест грувасткіх акуляраў і майстэрскага макіяжу. Што зробіш — нарадзілася брыдкім качанём. У інстытуце на мяне ніхто не звяртаў увагі, часу на спатканні я не марнавала — таму скончыла яго з адзнакай, затым аспірантуру... Толькі ў трыццаць выйшла замуж. Сама не чакала, што калега зробіць мне прапанову. Апошні час мы разам працавалі над адным праектам і так запрацаваліся, што разам і есці хадзілі, і да ночы на рабоце заседжваліся.

А калі праект здалі, ён і з'явіўся з пярсцёнкам і кветкамі. Я нават разгубілася, мужчына ж ён статны, прыгожы, і раптам — мне прапанову?.. Пражылі мы тры гады, дзетак яшчэ не было, але жылі добра, нават не верылася, што магу быць такая шчаслівая.

І вось аднойчы, вярнуўшыся з камандзіроўкі на суткі раней, я вырашыла зрабіць мужу сюрпрыз. Цягнік прыбываў на вакзал сярод ночы, і я на таксі прыехала дадому. Ціхенька адкрыла ключом дзверы і ўключыла ў вітальні святло...

Калі б гэта былі апошнія хвіліны перад апакаліпсісам, я б атрымала меншы стрэс, чым тады, калі ўбачыла прыгожыя жаночыя туфлікі і плашчык на вешалцы ў пярэднім пакоі. Свет абрушыўся і паляцеў у тартарары. Падлогу гайданула пад нагамі, і я прытулілася да сцяны. Што рабіць? Мяне літаральна трэсла, і гэта замінала засяродзіцца. Інстынктыўна схапіўшы парасон з тумбачкі, ледзь не рванула ў спальню. Неймавернае жаданне разбіць госці галаву паўстала само па сабе.

Але разважнасць спыніла. «Спакойна! Трэба падумаць, — я прыкладала вялізныя намаганні, каб супакоіцца. — Калі ўварвуся і ўчыню скандал, прыйдзецца разводзіцца... Ці хачу я страціць мужа? Не».

Я зразумела, што трэба шукаць іншае рашэнне. У спальні было ціха. Значыць, спяць, святло ў вітальні не разбудзіла.

Я ціхенька выключыла святло і на дыбачках выйшла з кватэры. Вярнулася на вакзал і, даўшы сабе невялікую перадышку, каб супакоіцца і каб голас не дрыжаў, патэлефанавала мужу:

— Мілы, я цябе разбудзіла? Я прыехала, і вельмі хачу дадому. А тут яшчэ цягнік затрымаўся... Забяры мяне з вакзала.

Праз хвілін сорак муж быў на вакзале і без усялякай памады на каўнерыку. Сустрэў мяне з кветкамі, і, калі б я не была дома гадзіну таму, ніколі б не здагадалася пра познюю госцю і нікому б не паверыла, калі б мне такое сказалі. Дома таксама ніякіх прыкмет прысутнасці дамы не выявілася. І я нічога не сказала мужу ні тады, ні пазней. Больш такіх здарэнняў не было. Муж — я гэта адчуваю — мяне кахае і паважае, жывём у міры і згодзе, у нас двое дзетак. Пражылі разам ужо трыццаць гадоў, і я рада, што тады прамаўчала, хоць гэта было няпроста.

Вядома, калі муж па жыцці паганец, трэба яго гнаць. Ну а калі чалавек добры і з ім поўнае паразуменне — то навошта ўсё рваць? З-за хвіліннай яго слабасці секчы канцы, бурыць сваё і яго жыццё? З кожным можа здарыцца. Няма такой сям'і, каб хоць раз у жыцці хтосьці не звярнуў «налева», а калі і ёсць, то адна на мільён.

...Гэта была адзіная лекцыя на курсах, якую мы, жанчыны, слухалі затаіўшы дыханне. І кожная прымервала сітуацыю на сябе...

**Валянціна БЫСТРЫМОВІЧ.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## СВЯТА НА ПАРОЗЕ

### СМАЧНА І ПРЫГОЖА

**Арыгінальнае афармленне страў на 23 лютага прыемна парадуе вашых блізкіх ці калег на рабоце. Аформіць стравы і святочны стол, улічваючы ваенную тэматыку, зусім нескладана.**

Тут падабрана некалькі варыянтаў афармлення, якія пад сілу кожнаму. Стравы можна аформіць у афіцыйным стылі, напрыклад у выглядзе зоркі. А можна зрабіць і больш забаўнае афармленне. Нават калі вы не збіраецеся накрываць святочны стол, можна арыгінальна аформіць стравы на вячэру.







### У выглядзе зоркі

Выкладзіце на блюда салату ў выглядзе зоркі, зверху пасыпце дзёртай морквай або чырвонай ікрой. Лічбы «23» выкласці можна з дапамогай гарошку.

Іншы варыянт «зоркі». Зверху пасыпаць салату чырвонай ікрой або зярнятамі граната. Для афармлення дадаткова можна выкарыстоўваць крабавыя палачкі, аліўкі і іншыя інгрэдыенты.

Аформіць стравы можна ў выглядзе танка, самалёта, кулямёта, ракеты, парашута.





### Смешна і прыемна

Такое арыгінальнае афармленне ацэняць многія мужчыны.







### ТОРТ «ПІЎНЫ КУФЕЛЬ»

***Спатрэбіцца:*** *для каржа: 1,5 шклянкі смятаны; 1,5 шклянкі мукі; 1,5 шклянкі цукру; 2 яйкі; 1 пакунак разрыхляльніка або 1 чайная лыжка соды. Для крэму: 1 шклянка густой смятаны; 1 шклянка цукру. Акрамя гэтага: печыва бісквітныя палачкі — 10—12 штук; вяршкі для ўзбівання — 200 г, цукар — 100 г, 1 абаранак для ручкі куфля.*

Узбіць яйкі з цукрам. Дадаць смятану і соду, узбіць. Затым засыпаць муку, зноў узбіць калатоўкай. Раздымную форму для выпечкі прамазаць маслам, уліць цеста ў форму і выпякаць пры тэмпературы 180 °С 30—40 хвілін. Бісквіт астудзіць і разрэзаць па гарызанталі на дзве часткі.



Зрабіць крэм: змяшаць смятану з цукрам і злёгку ўзбіць да растварэння цукру.

Шклянкай выразаць з бісквіту некалькі кружочкаў (гэта будуць маленькія каржы, з якіх сфарміруецца цыліндр піўнога куфля). Прамазаць іх смятанным крэмам, выкладваючы адзін на адзін, каб атрымаўся высокі міні-торт — аснова будучага куфля.

Бакі торта шчодра абмазаць крэмам і абкласці бісквітнымі палачкамі, шчыльна прыціснуўшы іх да торта так, каб у куфля з'явіўся характэрны рэльефны малюнак. Можна рэгуляваць вышыню куфля, выкарыстоўваючы крошкі ад торта або кавалачкі каржа.

Для ручкі ўставіць у торт абаранку. Пену зрабіць з узбітых з цукрам вяршкоў.

## КУЛІНАРНЫЯ ХІТРЫКІ

- **Рыс атрымаецца белы і смачны, калі пры варцы ў ваду дадаць трохі воцату.**
- Малако не збяжыць, калі бакі каструлі знутры намазаць алеем.
- **Калі бульба варыцца ў «мундзірах», пракаліце скурку ў некалькіх месцах — яна не разварыцца.**
- У посуд з соллю пакладзіце некалькі рысавых зярнятак — гэта захавае соль ад вільгаці і з'яўлення камякоў.
- **Адварная курыца будзе больш смачная, калі, выняўшы з булёну, вы пасоліце яе, а затым пакладзяце ў іншы посуд, накрыўшы вечкам альбо ручніком.**
- Крута замешанае цеста не будзе прыліпаць, калі яго раскачваць бутэлькай, напоўненай халодная вадой.
- **Кіслы тварог змяшайце з роўнай колькасцю свежага малака і пакіньце на ноч. Затым, адкінуўшы на друшляк, дайце малаку сцячы і пакладзіце тварог пад прэс. Маса стане далікатная і прыемная на смак.**
- Каб малако хутчэй ускіпела і не прыгарэла, можна пакласці ў яго трохі цукру.
- **Сушаныя грыбы патрымайце некалькі гадзін у малацэ, дадаўшы ў яго трохі солі. Яны стануць зусім як свежыя.**
- Каб рыба лепш чысцілася, абліце яе кіпенем — луска здымецца вельмі лёгка.
- **Замешваючы цеста, не высыпайце муку ў вадкасць, а наадварот, вадкасць паступова, тонкім струменьчыкам улівайце ў муку і перамешвайце.**
- Гарох і фасоля дрэнна разварваюцца ў жорсткай вадзе, таму прамытыя гарох і фасолю трэба замачыць з вечара ў халоднай вадзе (лепш кіпячонай) і ў гэтай жа вадзе варыць. Саліце у амаль гатовым выглядзе.

*АД РОДНАГА ТАТКІ ДАРАГІЯ Й ЛАТКІ (Беларуская народная прымаўка).*

# ПРАМА Ў СЭРЦА

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

***— Наталля Пятроўна, якія ўскладненні выклікае каранавірусная інфекцыя з боку сардэчна-сасудзістай сістэмы?***

— Гэта вострыя міякардыты, парушэнні рытму і праводнасці, або арытміі, а таксама трамбатычныя ўскладненні — інфаркты і інсульты, прычым нават у маладым узросце. Ускладняецца цячэнне хранічнай ішэмічнай хваробы сэрца. Калі чалавек хварэе, уключаюцца рэзервовыя механізмы арганізма і могуць абвастрацца хранічныя захворванні.

***— Сэрца — адна з галоўных пасля лёгкіх «мішэняў» для каранавіруса?***

— Вірус паражае лёгачную тканку. А яе запаленне выклікае гіпаксію — недахоп кіслароду, што вядзе да «галадання» розных органаў і сістэм. І самыя адчувальныя да гіпаксіі — цэнтральная нервовая сістэма, сэрца, у прыватнасці, міякард, і ныркі. Усе наступствы датычацца пераважна гэтых органаў і сістэм.

***— Цяжкія ўскладненні сардэчна-сасудзістай сістэмы — гэта вынік «цытакінавага шторму» або яны здараюцца і пры больш лёгкім цячэнні?***

**«У той час, калі не аказвалася планавая дапамога, нашы пацыенты ўсё роўна ведалі, што рабіць, бо яны навучаныя. Без нагляду яны не заставаліся і маглі да нас звяртацца».**

— Усё залежыць ад аб'ёму паражэння лёгачнай тканкі і асаблівасцяў імунітэту. Чым большае паражэнне лёгкіх, тым больш негатыўных наступстваў каранавіруснай інфекцыі.

***— Адным з ускладненняў з'яўляецца міякардыт — запаленне сардэчнай мышцы. Якія пасля яго могуць быць наступствы?***

— Вірус трапляе ў сардэчную мышцу і выклікае запаленне. Калі гэта востры працэс і своечасова была аказаная дапамога, то пра глабальныя наступствы размова не ідзе. Калі лячэнне несвоечасовае, вялікая зона паражэння, то наступствы могуць быць аж да развіцця ў такіх пацыентаў хранічнай недастатковасці кровазвароту.

***— Як праяўляе сябе міякардыт?***

— Ён можа быць і без боляў. З'яўляецца слабасць, праз нейкі час — субфебрыльная тэмпература. Але ў літаратуры апісаны выпадкі, якія сведчаць, што пасля выздараўлення ад каранавіруснай інфекцыі могуць таксама трымацца субфебрыльныя значэнні тэмпературы, таму спецыфічных праяў міякардыт не мае. Самастойна пацыент не вызначыць, ці гэта так праходзіць аднаўленне пасля віруснай інфекцыі, ці пачаў развівацца міякардыт.



***— Як тады можна яго выключыць?***

— Звярнуцца да ўрача, які прызначыць ЭКГ, і калі неабходна — УГД сэрца ці іншыя абследаванні.

***— Увогуле, якім чынам можна западозрыць праблемы з сэрцам пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі?***

— Калі з'явіліся непераноснасць фізічнай нагрузкі (звычайная для вас нагрузка выклікае задышку), павышаная стамляльнасць, то ў такім выпадку важна выключыць праблемы з сардэчна-сасудзістай сістэмай.

***— Як гэта зрабіць?***

— Трэба звярнуцца да ўрача, а не лячыцца паводле інтэрнэту ці па парадах знаёмых. І пачаць з элементарных абследаванняў — зрабіць электракардыяграму. У нас былі выпадкі, калі пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі ў пацыентаў выяўляліся такім чынам арытміі. Далей у залежнасці ад выніку атрыманага абследавання доктар вырашае, якія яшчэ неабходны абледаванні і якое лячэнне прызначаць.

***— Арытмія можа ўпершыню ўзнікнуць пасля COVID-19?***

— Так. Па маіх назіраннях, ёсць катэгорыя дастаткова маладых пацыентаў, якія не звярталі ўвагі на свой стан і лічылі сябе абсалютна здаровымі. А пасля перанесенай віруснай інфекцыі яны прыходзяць да нас з павышанымі значэннямі ціску. Магчыма, у іх была схільнасць, верагодна, і раней ціск быў павышаны, але да доктара яны не звярталіся. А можа быць, і каранавірусная інфекцыя стала пускавым механізмам у развіцці захворвання.

***— Ці можна пасля арытміі цалкам аднавіцца, або збоі рытму будуць здарацца пасля на працягу жыцця?***

— Усё залежыць ад віду арытміі. Як правіла, пацыенты аднаўляюцца. Самы распаўсюджаны від арытміі, які непакоіць пасля каранавіруснай інфекцыі, — сінусавая тахікардзія. Гэта пачашчэнне пульсу, якое сустракаецца, напэўна, у 90 % пацыентаў, што перахварэлі нават у лёгкай форме. Тут патрэбны час, каб прыйсці ў норму. Наш арганізм так устроены, што калі клеткам і тканкам не хапае кіслароду, каб яго атрымаць, запускаецца кампенсаторнае пачашчэнне сэрцабіцця. І калі ў перыяд хваробы сэрцабіцце было частае, то і пасля выздараўлення патрэбны час, каб сэрца вярнулася да нормы. Тут не патрэбны дадатковыя прэпараты, арганізм справіцца сам.

**«Асаблівую насцярожанасць павінны праявіць людзі, якія маюць лішнюю вагу, шкодныя звычкі, спадчынную схільнасць, у прыватнасці, калі сярод блізкіх былі выпадкі раптоўнай «сардэчнай» смерці ці праблемы з сардэчна-сасудзістай сістэмай».**

***— Што прыводзіць да інфарктаў і інсультаў пасля каранавіруса?***

— Трамбозы. За кошт загусання крыві ўтвараюцца тромбы, асабліва ў дробных сасудах.

***— Ці можа быць нетыповы інфаркт?***

— Так, ён можа быць бязбольным. Літаральна нядаўна ў нас быў пацыент, 37-гадовы мужчына, які на болі не скардзіўся. Яму зрабілі ЭКГ — а там распаўсюджаны інфаркт. На прыём да ўрача ён звярнуўся з нагоды высокіх значэнняў ціску. А месяц таму перахварэў на каранавірусную інфекцыю. Так што аб праблемах з сэрцам могуць сведчыць не толькі слабасць і задышка, але і значэнні ціску, на гэта таксама варта звярнуць увагу.

***— Праз які час пасля перанесенай інфекцыі могуць узнікнуць інфаркт ці інсульт?***

— Усё вельмі індывідуальна. Летась у нас быў выпадак, калі мужчына з інфарктам у анамнезе лячыўся ад COVID-19 амбулаторна. Прыйшоў закрываць бальнічны ліст пасля заканчэння тэрміну ізаляцыі і выздараўлення. Паскардзіўся, што, калі ішоў у паліклініку, дрэнна сябе адчуваў, непакоіў боль за грудзінай — і таксама на ЭКГ мы выявілі інфаркт.

Ён можа ўзнікнуць як падчас самой хваробы, так і праз нейкі час пасля яе. Узрост таксама не ўплывае: інфаркты сустракаюцца і ў маладых, і ў пажылых пацыентаў. Але калі своечасова была аказана дапамога, то нават пасля інсульту пацыенты аднаўляюцца.

***— Каму трэба праяўляць асаблівую насцярожанасць у дачыненні да свайго стану пасля каранавіруса?***

— Тым, хто раней пераносіў інфаркт ці мае іншыя праблемы з сардэчна-сасудзістай сістэмай. У іх і інфекцыя, як правіла, працякае больш цяжка. Што датычыцца маладых пацыентаў і тых, хто лічыць сябе здаровым у плане сардэчна-сасудзістай сістэмы, то асаблівую насцярожанасць павінны праявіць людзі, якія маюць лішнюю вагу, шкодныя звычкі, спадчынную схільнасць, у прыватнасці, калі сярод блізкіх былі выпадкі раптоўнай «сардэчнай» смерці ці праблемы з сардэчна-сасудзістай сістэмай. Такім пацыентам пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі, калі яны адчуваюць, што нешта не так, лепш звярнуцца да ўрача, каб пазбегнуць ускладненняў. Многія падчас і пасля перанесенага COVID-19 пачынаюць празмерна панікаваць, што лішняе. Важна звярнуцца да ўрача і абследавацца.

***— А калі інфекцыя працякала без запалення лёгкіх, ускладненні на сардэчна-сасудзістую сістэму таксама могуць быць?***

— Лёгкія формы, як правіла, ускладненняў не выклікаюць. Наступствы мы бачым пры распаўсюджаным паражэнні лёгачнай тканкі.

***— Ці можна чакаць усплёск сардэчна-сасудзістых захворванняў пасля эпідэміі каранавіруса?***

— У той час, калі не аказвалася планавая дапамога, нашы пацыенты ўсё роўна ведалі, што рабіць, бо яны навучаныя. Без нагляду яны не заставаліся і маглі да нас звяртацца. Магчыма, працэнт выяўлення сардэчна-сасудзістай паталогіі стане большы з-за таго, што людзі пачнуць часцей звяртаць на сябе ўвагу і задумаюцца пра сваё здароўе, перанёсшы гэтую цяжкую інфекцыю.

**Алена КРАВЕЦ.**

Прастора для творчасці

## Імгненне, спыніся...

### Рэспубліканскі фотаконкурс для школьнікаў упершыню пройдзе ў БДУ

**Творчае спаборніцтва ладзіцца, каб стварыць умовы для самарэалізацыі вучняў у галіне дзіцячай журналістыкі. Да ўдзелу ў ім запрашаюцца старшакласнікі беларускіх школ, ліцэяў і гімназій.**

Конкурс пройдзе ў трох намінацыях: «Прырода», «Людзі», «Невядомая Беларусь». У яго рамках юныя фатографы могуць паказаць маляўнічыя куткі і малавядомыя мясціны Беларусі, захаваць вобразы людзей у іх штодзённым або прафесійным жыцці.

Удзельнічаць можна адначасова ў трох катэгорыях, але прымаецца не больш за пяць фота ад аднаго аўтара. Здымкі павінны быць захаваны ў фармаце JPG без значнай апрацоўкі і з тлумачальным тэкстам. Фотаработы неабходна выслаць да 3 мая на электронны адрас: zhurnalistikifakultet01@gmail.com, а кароткую біяграфію і асабістае фота ў друкаваным выглядзе — на адрас: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, з пазнакай «Фотаконкурс для школьнікаў».

Імёны пераможцаў назавуць 15 мая. Іх чакаюць дыпломы і памятныя падарункі.

Арганізатарам мерапрыемства выступае факультэт журналістыкі БДУ пры ўдзеле міністэрстваў інфармацыі і адукацыі, грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз журналістаў», Рэспубліканскага фонду развіцця турызму і падтрымкі дзікай прыроды «Планета без межаў», рэспубліканскіх і рэгіянальных беларускіх СМІ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Эканоміка

## РОСТ ЦЭН ПАД КАНТРОЛЕМ

**Цэны на сацыяльна значныя тавары (СЗТ) у Беларусі ў студзені ў сярэднім выраслі на 1,3 %, аб гэтым паведамляецца на сайце Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.**

Найбольшы ўклад у прырост індэкса спажывецкіх цэн на СЗТ за месяц, акрамя лекавых сродкаў, унесла паражанне імпартуемых рыбы і рыбапрадуктаў у сярэднім на 1,8 %, алею і тлушчаў у сярэднім на 2 % (у тым ліку алею — на 3,9 %), агародніны, якая можа доўга ляжаць (бульба, буракі), — за кошт выдаткаў арганізацый на яе захоўванне ў студзені яна ў сярэднім падаражэла на 8,3 %. Разам з тым на асобную плодаагародніную прадукцыю (агуркі і яблыкі), якая ў цяперашні час увозіцца ў краіну, адзначаецца зніжэнне цэн у сярэднім на 2,4 % на фоне ўзмацнення жорсткасці падыходаў да рэгулявання цэн імпарцёраў СЗТ.

Што датычыцца прыросту цэн на сацыяльна значныя тавары ў гадавым вымярэнні, у студзені ён склаў 5,9 %, інфляцыя ў цэлым за мінулыя 12 месяцаў павялічылася да 7,7 %. Захаванне цанавых паказчыкаў на павышаным узроўні абумоўлена адменай льготнай стаўкі ПДВ на асобныя тавары, у тым ліку на сацыяльна значныя. Найбольшы «ўклад» у гадавы прырост цэн на СЗТ унесла павышэнне кошту лекавых прэпаратаў на 4,6 %, а таксама падаражанне маргарыну і кансерваў з рыбы. Акрамя таго, на рост цэн паўплывалі падаражанне імпартуемых тавараў і павышэнне адпускных цэн айчыннымі вытворцамі (з прычыны падаражання сыравіны і матэрыялаў у вытворчасці). Пры гэтым у студзені адзначаецца запаволенне росту цэн на СЗТ за кошт плодаагароднінай групы.

Прырост пастаянна рэгулюемых цэн і тарыфаў за 12 месяцаў склаў 7,3 %. У студзені падаражэла аўтамабільнае паліва (каля 1,1 % за месяц) і звадкаваны газ у балонах (на 1,3 %). Павышаны цэны на тытунёвыя вырабы (на 5,4 %) і гарэлку (на 2 %) з прычыны неабходнасці кампенсацыі павелічэння з 1 студзеня ставак акцызаў.

Дарэчы, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка неаднаразова заяўляў, што кантроль за цэнамі застанецца адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. За цэнаўтварэннем у Беларусі сочаць Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, але па просьбе Прэзідэнта таксама падключыліся дэпутаты і прафсаюзы. Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл Орда прызваў усе ведамствы сістэмна працаваць на апярэджанне росту цэн.

Індэкс спажывецкіх цэн на сацыяльна значныя тавары — адзін з параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, уведзены ўрадам у 2021 годзе. Ён разлічваецца Нацыянальным статыстычным камітэтам на 72 таварах штодзённага попыту. У яго ўключаны мяса, малако і прадукты з іх, каўбасы, рыба, бакалея, хлеб, агародніна, аўтамабільнае паліва, асобныя лекавыя прэпараты.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП400049968) 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, в лице ликвидатора Лобко Александра Николаевича, тел. 8 (02353) 2-18-74.

